Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 195 (6472) | 26 жніўня 1939 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

2. Всесоюзная библиотека

СЁННЯ У НУМАРЫ:

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб скліканні Чацвертай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Заключэнне совецка-германскага дагавора аб ненападзе.

Рэспубліканская нарада па пытаннях прапаганды і агітацыі ў комсамоле.

Усебеларуская нарада актыва работнікаў лёгкай прамысловасці.

Семінар работнікаў аддзелаў кадраў парторганаў.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

З. Ларысаў, У. Калымага — Інструктары гаркома партыі.

Б. Зельцэр — Як фарміраваць гурткі.

Р. Сыркін — 3.000 новых агітатараў.

АРТЫКУЛЫ:

Н. Сяргеева — ЗША перад прэзідэнцкімі выбарамі.

Н. Гіршын, І. Васількоў — Безініцыятыўныя кіраўнікі.

І. Муравіцкі — Багатыя рэсурсы.

На абласных нарадах па жывёлагадоўлі.

Удзельнікі велапрабегу сопка Заазёрная—Заходняя граніца — у БССР.

Ад Усходняй да Заходняй граніц.

М. Саранчук — Што мне дала выстаўка.

К. Н. Мінкевіч — Вітаем дагавор працоўных двух рубяжоў.

ЗА РУБЯЖОМ:

Замежны друк аб совецка-германскім дагаворы аб ненападзе.

Ваенныя мерапрыемствы ў Польшчы.

Ваенныя меры ў Англіі.

Фінляндскі міністр аб Усесаюзнай выстаўцы.

Японцы страцілі забітымі 600 чалавек.

Перагаворы паміж Польшчай і Данцыгам спынены.

Перамога амерыканскіх фермераў.

СОВЕЦКА-ГЕРМАНСКІ ДАГАВОР АБ НЕНАПАДЗЕ

Дагавор аб ненападзе, заключаны паміж Совецкім Саюзам і Германіяй, тэкст якога мы публікуем сёння, прадстаўляе сабой дакумент важнейшага значэння, які аллюстроўвае паслядоўную мірную палітыку Совецкага Саюза.

Знешняя палітыка Совецкага Саюза нязменна зыходзіла з імкнення адстаяць і захаваць справу міру. У гэтай сваёй палітыцы СССР нязменна імкнуўся да падтрымання і ўмацавання дружаственых і дзелавых сувязей з усімі гымі дзяржавамі, якія надзялялі гэтую пазіцыю. Таварыш Сталін у справаздачным дакладзе на XVIII з'ездзе партыі ў сваёй характарыстыцы знешняй палітыкі Совецкага Саюза заявіў:

«мы стаім за мір і ўмацаванне дзелавых сувязей з усімі краінамі, стаім і будзем стаяць на гэтай пазіцыі, паколькі гэтыя краіны будуць трымацца такіх-жа адносін з Совецкім Саюзам, паколькі яны не паспрабуюць нарушыць інтарэсы нашай краіны».

Дагавор аб ненападзе, заключаны Совецкім Саюзам з Германіяй, знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці з пазіцыяй Совецкага Саюза як яна была вызначана таварышам Сталіным.

Адносіны паміж СССР і Германіяй з моманту аднаўлення нармальных дыпламатычных адносін рэгуляваліся паслядоўна рапальскім дагаворам, заключаным у 1922 годзе, і дагаворам аб нейтралітэце, заключаным 24 красавіка 1926 года. Дагавор 1926 года ўстанаўляе, што ў «выпадку, калі адна з дагаварваючыхся старон, не гледзячы на міралюбівы вобраз дзеянняў, падвергнецца нападу трэціх дзяржаў або некалькіх трэціх дзяржаў, то другая дагаворваючаяся старана будзе захоўваць нейтралітэт на працягу ўсяго канфлікта». У тым-жа дагаворы ўказвалася, што «калі ў сувязі з канфліктам упамінаемага ў арт. II-гім характару або калі ні адна з дагаварваючыхся старон не будзе замешана ва ўзброеных сутычках, будзе ўтворана паміж трэцімі дзяржавамі кааліцыя з мэтай падвергнуць эканамічнаму або фінансаваму байкоту адну з дагаварваючыхся старон, другая дагаварваючаяся старана да такой кааліцыі прымыкаць не будзе».

Падпісаны 23 жніўня дагавор аб ненападзе, як указваецца ў тэксце яго, выходзіць з гэтых асноўных палажэнняў дагавора 1926 года, але ў той-жа час змяшчае і далейшае развіццё гэтых палажэнняў у мэтах умацавання мірных адносін паміж абодвума краінамі. Так у артыкуле 1 дагавора ўказваецца, што абедзве дагаварваючыяся стораны бяруць на сябе абавязацельства ўстрымлівацца ад усякіх агрэсіўных дзеянняў у адносінах адна другой, як асобна, так і сумесна з іншымі дзяржавамі.

Артыкул II-гі дагавора прадугледжвае захаванне нейтралітэта адпаведнай дагаварваючайся староной у выпадку, калі другая старана стане аб'ектам ваенных дзеянняў трэцяй дзяржавы.

Бясспрэчна, буйнейшае значэнне мае артыкул IV-ты, які накладвае на дагаварваючыяся стораны абавязацельствы не ўдзельнічаць у якой-небудзь групіроўцы дзяржаў, якая прама або ўскосна накіравана супроць другой краіны.

Важнае значэнне артыкула V-га дагавора вызначаецца тым, што ён прадугледжвае выключна мірны метад вырашэння ўсяжкіх спрэчак і канфліктаў у выпадку, калі такавыя ўзнікнуць паміж абодвума дагаварваючыміся старанамі.

Дзесяцігадовы тэрмін дагавора, устанаўляемы артыкулам VI-м, сведчыць аб тым, што абедзве стораны праяўляюць імкненне замацаваць мірныя адносіны паміж абодвума краінамі на працяглы перыяд часу.

Змест кожнага асобнага пункта дагавора, як і ўсяго дагавора ў цэлым, прасякнут імкненнем унікнуць канфлікта, умацаваць мірныя і дзелавыя адносіны паміж абодвума дзяржавамі. Няма ніякага сумнення, што заключаны дагавор аб ненападзе ліквідуе напружанасць, існаваўшую ў адносінах паміж СССР і Германіяй.

Аднак значэнне заключанага дагавора выходзіць за рамкі ўрэгуліравання адносін толькі паміж абодвума дагаварваючымі ся краінамі. Ён заключан у момант, калі міжнародная абстаноўка дасягнула вельмі вялікай вастрыні і напружанасці. Мірны акт, якім з'яўляецца дагавор аб ненападзе паміж СССР і Германіяй, несумненна будзе садзейнічаць аблягчэнню напружання ў міжнароднай абстаноўцы, несумненна дапаможа разрадзіць гэтую напружанасць.

Заключэнне дагавора паміж СССР і Германіяй з'яўляецца несумненна фактам буйнейшага міжнароднага значэння, бо дагавор прадстаўляе сабой інструмент міру, закліканы не толькі ўмацаваць добрасуседскія і мірныя адносіны паміж СССР і Германіяй, але і служыць справе ўсеагульнага ўмацавання міру.

Варожасці паміж Германіяй і СССР кладзецца канец. Адрознене ў ідэалогіі і ў палітычнай сістэме не павінна і не можа служыць перашкодай для ўстанаўлення добрасуседскіх адносін паміж абодвума краінамі. Дружба народаў СССР і Германіі, загнаная ў тупік стараннямі ворагаў Германіі і СССР, ад гэтага часу павінна атрымаць неабходныя ўмовы для свайго развіцця і росквіту.

(Перадавы артыкул «Правды»).

К заключэнню совецка-германскага дагавора аб ненападзе. НА ЗДЫМКУ (справа налева): тав. В. М. Молатаў, тав. І. В. Сталін, п. Іоахім фон Рыбентроп і п. Ф. Гаус.
Здымак зроблен 23 жніўня 1939 г. Фото М. Калашнікава («Правда»).

ЗАКЛЮЧЭННЕ СОВЕЦКА-ГЕРМАНСКАГА ДАГАВОРА АБ НЕНАПАДЗЕ

23-га жніўня ў 3 гадзіны 30 мін. дня адбылася першая гутарка старшыні Соўнаркома і Народнага Камісара Замежных Спраў СССР тав. Молатава з міністрам замежных спраў Германіі п. фон-Рыбентропам па пытанню аб заключэнні пакта аб ненападзе. Гутарка адбывалася ў прысутнасці тав. Сталіна і германскага пасла п. Шуленбурга і прадаўжалася каля 3-х гадзін. Пасля перапынку ў 10 гадзін вечара гутарка была адноўлена і закончылася падпісаннем дагавора аб ненападзе, тэкст якога прыводзіцца ніжэй.

Дагавор аб ненападзе паміж Германіяй і Совецкім Саюзам

Урад СССР і
Урад Германіі

Кіруемыя жаданнем умацавання справы міру паміж СССР і Германіяй і зыходзячы з асноўных палажэнняў дагавора аб нейтралітэце, заключанага паміж СССР і Германіяй у красавіку 1926 года,

прышлі да наступнага пагаднення:

Артыкул I.

Абедзве Дагаварваючыяся Стораны абавязваюцца ўстрымлівацца ад усякага насілля, ад усякага агрэсіўнага дзеяння і ўсякага нападу ў адносінах адна другой, як асобна, так і сумесна з іншымі дзяржавамі.

Артыкул II.

У выпадку, калі адна з Дагаварваючыхся Старон акажацца аб'ектам ваенных дзеянняў з боку трэцяй дзяржавы, другая Дагаварваючаяся Старана не будзе падтрымліваць ні ў якай форме гэтую дзяржаву.

Артыкул III

Урады абодвух Дагаварваючыхся Старон застануцца ў будучым у кантакце адзін з другім для кансультацыі, каб інфарміраваць адзін другога аб пытаннях, закранаючых іх агульныя інтарэсы.

Артыкул IV.

Ні адна з Дагаварваючыхся Старон не будзе ўдзельнічаць у якой-небудзь групіроўцы дзяржаў, якая прама або ўскосна накіравана супроць другой староны.

Артыкул V.

У выпадку ўзнікнення спрэчак або канфліктаў паміж Дагаварваючыміся Старанамі па пытаннях таго ці іншага роду, абедзве стораны будуць вырашаць гэтыя спрэчкі або канфлікты выключна мірным шляхам у парадку дружаственага абмену думкамі або ў патрэбных выпадках шляхам стварэння камісій па ўрэгуляванню канфлікта.

Артыкул VI.

Гэты дагавор заключаецца тэрмінам на дзесяць год з тым, што паколькі адна з Дагаварваючыхся Старон не дэнансіруе яго за год да скончэння тэрміна, тэрмін дзеяння дагавора будзе лічыцца аўтаматычна прадоўжаным на наступныя пяць год.

Артыкул VII.

Гэты дагавор падлягае ратыфікаванню ў магчыма кароткі тэрмін. Абмен ратыфікацыйнымі граматамі павінен адбыцца ў Берліне. Дагавор уступае ў сілу неадкладна пасля яго падпісання.

Складзен у двух арыгіналах, на нямецкай і рускай мовах у Маскве, 23 жніўня 1939 года.

Па ўпаўнаважанню Ўрада СССР
В. МОЛАТАЎ.

За Ўрад Германіі
І. РЫБЕНТРОП.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АБ СКЛІКАННІ ЧАЦВЕРТАЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Склікаць пазачарговую Чацвертую Сесію Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік 28 жніўня гэтага года ў гор. Маскве.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
24 жніўня 1939 г.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАРАДА ПА ПЫТАННЯХ ПРАПАГАНДЫ І АГІТАЦЫІ Ў КОМСАМОЛЕ

Учора, 25 жніўня, у клубе работнікаў Дзяржгандлю адкрылася рэспубліканская нарада па пытаннях прапаганды і агітацыі ў комсамоле, скліканая ЦК ЛКСМБ. На нарадзе прысутнічае звыш 100 чалавек—сакратары абкомаў ЛКСМБ па прапаганде, загадчыкі аддзелаў прапаганды і агітацыі райкомаў комсамола, інструктары райкомаў, кіраўнікі лепшых агітколектываў, лектары.

Бурнымі доўгімі апладысментамі сустракаюць удзельнікі нарады прапанову аб выбранні начотнага прэзідыума. У састаў начотнага прэзідыума выбіраюцца члены і кандыдаты Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным, а таксама тт. Дзімітраў, Тэльман, Хозе Дыяс, Даларэс Ібаруры.

Даклад аб задачах комсамольскіх арганізацый рэспублікі ў падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных зрабіў сакратар ЦК ЛКСМБ па прапагандзе тав. Ефройкін.

У спрэчках па дакладу выступіла 15 чалавек.

Выступаўшыя таварышы падзяліліся вопытам агітацыйна-масавай работы ў калгасах, саўгасах на прадпрыемствах і ва ўстановах, крытыкавалі рад райкомаў комсамола за недастатковую ўвагу да агітатараў. Тав. Сямёнава — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Дзержынскага райкома комсамола—расказала аб рабоце агітатара ордэнаносца Кісялёва, які змястоўнымі і цікавымі гутаркамі з калгаснікамі заваяваў вялікі аўтарытэт.

З выступленняў раду таварышаў вынікае, што ў некаторых раёнах разгубілі агітатараў. У Каспюковіцкім раёне, як указаў тав. Болбас, з 150 агітатараў, якія працавалі ў часе выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, зараз працуюць толькі 20.

Сёння нарада прадаўжае сваю работу.

АД'ЕЗД З МАСКВЫ МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ГЕРМАНІІ п. ФОН РЫБЕНТРОПА

24 жніўня ў 13 гадзін 25 мінут з Масквы адбыў міністр замежных спраў Германіі п. Іоахім фон Рыбентроп.

На Цэнтральным аэрапорце п. фон Рыбентропа праважалі: Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. П. Пацёмкін, Намеснік Народнага Камісара Знешняга Гандлю тав. М. С. Сцепанаў, Намеснік Старшыні Массовета тав. Д. Д. Каралёў, Загадчык Пратакольным Аддзелам Наркамата Замежных Спраў тав. В. Н. Баркоў, Загадчык Цэнтральна-Еўрапейскім Аддзелам НКЗС тав. А. М. Александраў, камендант горада Масквы палкоўнік т. Ф. І. Суворaў, састаў германскага пасольства на чале з Надзвычайным і Поўнамоцным Паслом Германіі графам фон дэр Шуленбург і Надзвычайны і Поўнамоцны Пасол Італіі п. Россо. (ТАСС).

ПРЫЕЗД У МАСКВУ ВІЦЭ-МІНІСТРА ЗЕМЛЯРОБСТВА ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ п. КРАВУЛЬСКАГА

24 жніўня ў Маскву на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку прыбыў віцэ-міністр земляробства Польскай рэспублікі п. Кравульскі.

На Беларускім вакзале п. Кравульскі быў сустрэт Намеснікам Народнага Камісара Земляробства тав. І. Ф. Васіным, в. а. Старшыні ВОКС'а тав. В. Ф. Смірновым, Намеснікам Загадчыка Пратакольным Аддзелам Наркамата Замежных Спраў тав. Б. Г. Панцікавым, адказным рэферэнтам Усходне-Еўрапейскага Аддзела НКЗС тав. П. П. Лістапад і саставам польскага пасольства на чале з саветнікам пасольства п. Янкоўскім. (ТАСС).

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА АКТЫВА РАБОТНІКАЎ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Учора ў Мінску, у Доме партактыва, адкрылася Усебеларуская нарада актыва работнікаў лёгкай прамысловасці.

У рабоце нарады прымаюць удзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. Грэжава. Нарком лёгкай прамысловасці СССР тав. Лукін, намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Захараў, дэлегацыя ад Наркамата лёгкай прамысловасці брацкай Украінскай рэспублікі.

Даклад аб рабоце лёгкай прамысловасці БССР за першае паўгоддзе зрабіў Наркомлегпром тав. Курган.

Лёгкая прамысловасць рэспублікі дабілася ў першым паўгоддзі значных поспехаў. Вытворчая праграма выканана на 107,4 проц. Звыш плана выпушчана прадукцыі на 12 мільёнаў рублёў. З 145 прадпрыемстваў заданне выканалі 139.

Падрабязна аналізуючы работу кожнай галіны прамысловасці, тав. Курган завастрае ўвагу актыва на адстаючых участках. На многіх прадпрыемствах (швейных, абутковых, скураных), якасць прадукцыі яшчэ нізкая. Ні адна абутковая фабрыка не выканала сваё заданне па выпуску першасортных бацінак.

Рад гаспадарнікаў груба нарушае план па асартыменту. Віцебская фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» (дырэктар тав. Партной) не дадала ў першым паўгоддзі на дзесяткі тысяч рублёў дэмісезонных, дзіцячых паліто. Такія з'явішчы наглядаюцца таксама на фабрыках імені Валадарскага і імені Дзержынскага.

Рэзкай крытыцы была падвергнута работа шклопрамысловасці. Дабіўшыся некаторых поспехаў у першым паўгоддзі, кіраўнікі шклоўпраўлення аслабілі сваю ўвагу да вытворчасці. Буйнейшы шкласавод «Кастрычнік» у Ліпені і ў жніўні не выканаў сваё заданне. Дрэнная арганізацыя тэхналагічнага працэса, слабая працоўная дысцыпліна, безадказнасць — вось прычыны адставання шклопрамысловасці.

У заключэнне тав. Курган заклікае актыў замацаваць поспехі першага паўгоддзя і ўтрымаць за сабой першае месца ў спаборніцтве з Наркаматам лёгкай прамысловасці Украінскай ССР.

У спрэчках па дакладу выступілі стаханаўцы тт. Кармоў (абутковая фабрыка «Праца»). Галубцова, Сырова (швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі»), Янгулін (скурзавод імені Сталіна), Одэрзух (абутковая фабрыка імені Кагановіча) і інш.

Нарада актыва аднадушна, пад бурныя воўга незмаўкаючыя апладысменты прыняла тэкст прывітальнай тэлеграмы правадыру народаў таварышу Сталіну.

Семінар работнікаў аддзелаў кадраў парторганаў

З 20 па 25 жніўня ў Мінску праходзіў скліканы ЦК КП(б)Б рэспубліканскі семінар, на якім прысутнічалі сакратары абкомаў, гаркомаў і райкомаў партыі па кадрах, работнікі аддзелаў кадраў абкомаў і ЦК КП(б)Б—усяго каля 200 чалавек.

Для ўдзельнікаў семінара былі прачытаны лекцыі на тэмы—вучэнне Леніна—Сталіна аб кадрах, план трэцяй пяцігодкі БССР, аб міжнародным становішчы і інш.

З вялікай зацікаўленасцю слухалі ўдзельнікі семінара даклады, зробленыя сакратаром ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка, аб вынікаў работы Майскага пленума ЦК ВКП(б) і аб задачах работы аддзелаў кадраў.

Нарком унутраных спраў БССР тав. Цанава расказаў партыйным работнікам аб каварных метадах работы замежных разведак. (БЕЛТА).

ВЫПУСК ТРАКТАРЫСТАК

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. 25 жніўня. (БЕЛТА). Жыва адгукнуліся дзяўчаты Чырвона-Слабодскага раёна на заклік аб падрыхтоўцы без адрыву ад вытворчасці 100 тысяч трактарыстак. У раёне вывучаюць трактарную справу 87 калгаснiц.

У сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоная Зара», Малышэвіцкага сельсовета, днямі адбыўся першы выпуск трактарыстак. Тут аўладалі трактарам без адрыву ад вытворчасці 6 калгасніц, 4 з іх здалі іспыты на выдатна.

На сходзе ў чэсць выпуска выступіла тав. Лемеш Анна. Яна сказала:

Шчыра дзякую нашай партыі і роднаму Сталіну за шчаслівае і радаснае жыццё. Я з поспехам аўладала складанай машынай. Заўсёды гатова сесці на трактар і працаваць на нашых сацыялістычных палях.

Калгасніцы Лемеш Анна, Акубовіч Антаніна і інш. за выдатнае аўладанне трактарам прэміраваны Бялевіцкай МТС.

МАРУДЗЯЦЬ З СЯЎБОЙ АЗІМЫХ

ШКЛОЎ. (Кар. «Звязды»). План сяўбы азімых культур па раёну сёлета складае 14.600 гектараў, з іх 2.000 гектараў азімай пшаніцы. Аднак, да сяўбы ні ў адным калгасе яшчэ не прыступілі. У раёне вельмі слаба падрыхтаваліся да гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

На занятых папарах будзе засяваецца 4.520 гектараў жыта, але апрацоўка папараў не распачата. Кіраўнікі райза і МТС не ўдзяляюць гэтаму ніякай увагі.

У раёне яшчэ не пачаўся абмен радавога насення на сартавое. Калгасы Стара-Вадвянскага, Каменалаўскага і Таўкачоўскага сельсовета з года ў год сеялі радавым насеннем, атрымлівалі нізкі ўраджай. Сёлета ёсць усе магчымасці — і яны абавязаны насеяць высокасортным насеннем. Аднак калгасам не ўказана, дзе яны павінны абмяняць насенне. Яшчэ горш з праверкай годнасці насення і яго пратручваннем. Гэта работа яўна зрываецца.

У раёне не рэалізуюцца завезеныя пад азімыя мінеральныя ўгнаенні. З 206 калгасаў раёна толькі некаторыя («Першы май», «Чырвоная Аўчаса», «Чырвоныя Сліжы», Сліжаўскага сельсовета, і калгасы Славенскага сельсовета) узялі па 3 тоны. 250 тон фасфарытнай мукі і азоцістых угнаенняў не вывозіцца.

Райком партыі і райвыканком малюць што зрабілі, каб забяспечыць поспех сяўбы азімых.

В. БАТУРЫН.

ХРОНІКА

23 жніўня ў ВОКС'е (Усесаюзным таварыстве культурнай сувязі з загранiцай) адбыўся прыём у чэсць германскай дэлегацыі, прыбыўшай у Маскву на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

На прыёме прысутнічалі: дырэктар Дэпартамента міністэрства земляробства Германіі п. Морыц, прафесар Майер, граф Гротэ, член калегіі Наркамзема тав. Маісееў, акадэмік Ліскун, адказны сакратар Акадэміі сельскагаспадарчых навук імені В. І. Леніна тав. Чмора, адказныя работнікі НКЗС і ВОКС'а. (ТАСС).

НА АБЛАСНЫХ НАРАДАХ ПА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

МІНСК

Учора адкрылася нарада перадавікоў жывёлагадоўлі Мінскай вобласці. На нарадзе прысутнічала больш 300 чалавек. Сярод іх—перадавікі жывёлагадоўлі, узнагароджаныя ордэнамі і медалямі Саюза ССР.

З дакладам аб рэалізацыі пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах» выступіў сакратар мінскага абкома КП(б)Б тав. Матвееў.

У сваім дакладзе тав. Матвееў адзначыў, што за апошнія годы жывёлаводы вобласці дабіліся вялікіх поспехаў. 45 лепшых стаханаўцаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі Саюза ССР, 57 ферм і 460 перадавікоў жывёлагадоўлі ўдзельнічаюць ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Разам з гэтым тав. Матвееў падрабязна спыніўся на недахопах, якія яшчэ маюць месца ў жывёлагадоўлі, і паставіў рад канкрэтных задач па ажыццяўленню пастановы партыі і ўрада аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Першым выступіў старшы заатэхнік Старадарожскага раёна тав. М. К. Ільінчык.

— Калгасы нашага раёна, — гаворыць ён, — дабіліся вялікіх паспехаў у жывёлагадоўлі. У параўнанні з 1934 годам удвая вырасла пагалоўе буйнай рагатай жывёлы. Пагалоўе авечак узрасло на 495 проц., коней — на 121,5 проц.

Выраслі сапраўдныя майстры жывёлагадоўлі, як Суклета Луктава, якая штогодна вырошчвае больш 100 цялят і не мае адыходу 22 работнікі жывёлагадоўлі ўдзельнічаюць на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Шырыцца фронт спаборніцтва за права ўдзелу ў выстаўцы ў 1940 годзе. Аднак, яшчэ ёсць рад сур'ёзных недахопаў. У раёне фактычна сарвана будаўніцтва канюшань, кароўнікаў.

Цікавым было выступленне старшыні калгаса «Прамень Комуны», Слуцкага раёна тав. К. В. Гурбо. Калгас за апошнія годы значна развіў жывёлагадоўлю—ёсць 4 фермы, з іх 2 племянных. На племяннной конеферме — 226 коней. У калгасе ёсць 300 галоў буйнай рагатай жывёлы, 194 свінні. Гэтыя цыфры значна перавышаюць устаноўлены дзяржавай мінімум. Менш развіта аўцагадоўля.

6 перадавікоў жывёлагадоўлі калгаса ўдзельнічаюць ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Сёлета ў калгасе ўведзен правільны севаабарот з улікам травасеяння для растучай жывёлагадоўлі.

Цёпла сустрэлі ўдзельнікі нарады з'яўленне на трыбуне маладога жывёлавода вобласці — 17-гадовага аўчара калгаса «Пяцігодка», Пухавіцкага раёна, тав. І. В. Рагалевіча. Тав. Рагалевіч працуе аўчаром 4 годы. За гэты час ён ад 9 аўцаматак вытадаваў 300 авечак, дабіўся атрымання двух ягнят ад аўцаматкі ў кожны акот.

У спрэчках, таксама выступілі А. А. Дзмітрук, — старшыня калгаса імені Сталіна, Старадарожскага раёна, М. П. Елагін—загадчык фермы калгаса імені 10-годдзя БССР, Старадарожскага раёна і інш.

**
*

На вячэрнім пасяджэнні прадаўжаліся спрэчкі па дакладу тав. Матвеева. З вялікай увагай удзельнікі нарады праслухалі выступленне пастуха калгаса імені Войкава, Мінскага раёна, тав. П. Д. Гарнашэвіча.

— Я пятнаццаць год пасу жывёлу, — гаворыць ён. — Раней пасвіў чужых кароў. Цяпер пасу сваіх—калгасных. Сёлета ў маім статдзе 104 каровы. Усіх іх я вяду на пераліку.

Пасвіць жывёлу не так ужо і проста Пасьбішча я раздзяляю на тры ўчасткі. Калі сёння каровы пасліся на адным участку, то заўтра я ганю іх на другі, а паслязаўтра — на трэці. Пры такой змене ўчасткаў трава паспявае адрастаць, і каровы мае заўсёды бываюць сытыя.

Я ўжо стары — мне 71 год. Сёлета думаў не працаваць. Аднак па просьбе калгаснікаў не вытрымаў, згадзіўся працаваць, бо, як казалі калгаснікі, лепшага пастуха ў калгасе няма.

Усе прысутныя горача апладыравалі гэтаму энтузіясту жывёлагадоўлі.

Таксама выступілі П. А. Шавель—загадчык Пухавіцкага райза, М. Е. Пашкевіч — начальнік упраўлення жывёлагадоўлі Мінскай вобласці і іншыя.

Пад бурныя апладысменты ўдзельнікі нарады прынялі прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну.

Сёння нарада прадаўжае работу.

ГОМЕЛЬ

ГОМЕЛЬ, 25 жніўня. (Кар. «Звязды»). Сёння адкрылася абласная нарада па жывёлагадоўлі, на якой прысутнічаюць 300 чалавек. Сярод прысутных многа ордэнаносцаў, дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР, экспанентаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

З дакладам аб рэалізацыі пастановы СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах» выступіў сакратар абкома КП(б)Б тав. Жыжэнкоў.

— Пастанова партыі і ўрада, — гаворыць у сваім дакладзе тав. Жыжэнкоў,—мае велізарнае значэнне ў справе далейшага ўздыму грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах. Гэты гістарычны дакумент прасякнут сталінскімі клопатамі аб калгасным сялянстве, аб далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, аб росце культурнага і заможнага жыцця калгаснікаў.

Калгаснікі Гомельскай вобласці разам з працоўнымі ўсёй краіны за годы сталінскіх пяцігодак дабіліся значных поспехаў у развіцці соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

На 1 студзеня ў калгасах вобласці налічвалася 1.870 калгасных жывёлагадоўчых ферм. Разам з ростам агульнага пагалоўя быстрымі тэмпамі расце племянная жывёла; значна павысілася яе прадукцыйнасць. У грамадскім стадзе вобласці ёсць 1.051 племянны бык остфордскай пароды, 321 бык швіцкай пароды, 1.005 племянных баранаў «цыгай» і «прэкос» і 1.478 галоў чыстасортных англійскіх хракаў.

Усё гэта з'яўляецца багаццем калгасаў, здабытым чэснай працай калгасных мас.

— Большасць калгаснікаў вобласці,—гаворыць далей дакладчык,—на справе пераканалася, якую велізарную выгоду прыносіць соцыялістычная жывёлагадоўля калгаснаму сялянству.

Калгас «Чырвоны працаўнік», Гомельскага раёна, мае 120 дойных кароў. У 1938 годзе надоена 253.170 літраў малака, што складае ў сярэднім на кожную карову 2.108 літраў. Даход гэтага калгаса ад жывёлагадоўлі ў 1934 годзе склаў 47.607 рублёў, а ў 1938 годзе 247.385 рублёў.

Загадчык свіна-таварнай фермы калгаса імені Сталіна, Веткаўскага раёна, Андрэй Маркавіч Бліннікаў атрымаў ад 25 свінаматак 476 парасят. Стараннай працай тав. Бліннікаў дабіўся, што на ферме не было ні аднаго выпадку падзяжу свіней.

Ордэнаносец калгаса «Днепроўская Комуна», Лоеўскага раёна, Елізавета Грань штогод вырошчвае 100 цялят, сярэднесутачная прывага кожнага цялёнка складае 650 грамаў.

— Прыклады ўпорнай стаханаўскай работы перадавых людзей соцыялістычнай жывёлагадоўлі можна сустрэць у любым калгасе. Разам з тым, — гаворыць дакладчык, — кіраўнікі некаторых калгасаў пагардліва адносяцца да развіцця соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Ёсць рад фактаў безгаспадарчых, варварскіх адносін да жывёлы, ёсць нямала выпадкаў падзяжу жывёлы, адыходу маладняка, а таксама і буйнай рагатай жывёлы.

Тав. Жыжэнкоў завастрыў увагу нарады на баявым выкананні пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі калгасаў».

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Выступаўшыя таварышы дзяліліся вопытам сваёй работы, уносілі каштоўныя прапановы па паляпшэнню жывёлагадоўлі.

На нарадзе прысутнічае дэлегацыя жывёлаводаў Чарнігаўскай вобласці УССР. У рабоце нарады прымае ўдзел сакратар ЦК КП(б)Б т. **Малін.**

Заўтра нарада прадаўжае сваю работу.

ВІЦЕБСК

ВІЦЕБСК, 25 жніўня. **(Кар. «Звязды»).** У другі дзень нарады перадавікоў жывёлагадоўлі прадаўжаліся спрэчкі па дакладу сакратара абкома КП(б)Б тав. Стулава аб ходзе рэалізацыі пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах.

Загадчык малочна-таварнай фермы калгаса «Роскаліт», Крычаўскага раёна тав. **Пазнякоў** расказаў аб тым, што калгас ужо выканаў гадовы план мяса-і малакапаставак за 1939 год і прыступіў да выканання плана мясапаставак за 1940 год. Апрача таго калгас прадаў 10 тысяч літраў малака ў парадку дзяржаўных закупак. У калгасе ёсць 4 жывёлагадоўчыя фермы: малочна-таварная, свінагадоўчая, аўцагадоўчая і конеферма. Уся жывёла забяспечана кармамі, і ёй рыхтуецца сытая і цёплая зімоўка. Калгас перавыканаў план сіласавання.

Свінарка калгаса «Авангард», Аршанскага раёна, Еўдакія **Петракова** падзялілася вопытам сваёй работы па вырошчванню свіней. У мінулым годзе яна атрымала ад 10 свінаматак 220 парасят.

— Я,—гаворыць тав. Петракова,—удастоілася чэсці быць на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, падрабязна знаёмілася з вопытам работы перадавікоў грамадскай жывёлагадоўлі. Гэты вопыт я буду прымяняць у сваёй штодзённай практычнай рабоце.

Важнае пытанне закрануў у сваім выступленні заатэхнік аблза тав. **Немікін.** Ён звярнуў увагу ўдзельнікаў нарады на неабходнасць, побач з развіццём буйнай рагатай жывёлы, больш шырока развіваць дробную жывёлагадоўлю—кролікаводства, птушкаводства і інш.

Аб радзе практычных мерапрыемстваў па далейшаму развіццю грамадскай жывёлагадоўлі гаварыў у сваім выступленні намеснік старшыні аргкамітэта Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР па Віцебскай вобласці т. **Жукоўскі.**

З яркай прамовай выступіў на нарадзе цёпла сустрэты прысутнымі старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР т. **Наталевіч.** Ён заклікаў усіх удзельнікаў нарады і калгаснікаў вобласці пабольшэвіцку рэалізаваць пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб мерапрыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах.

Усяго ў спрэчках выступіла 25 чалавек.

Нарада прыняла зварот да ўсіх калгасніц калгаснікаў, работнікаў жывёлагадоўчых ферм, спецыялістаў сельскай гаспадаркі і навуковых работнікаў Віцебскай вобласці — уключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі за далейшы ўздым грамадскай жывёлагадоўлі, за права ўдзелу ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў 1940 годзе.

З вялікім уздымам удзельнікі нарады паслалі прывітальнае пісьмо вялікаму Сталіну.

НЕДАПУШЧАЛЬНА ЗАЦЯГНУЛІ ЎБОРКУ СЕНАЖАЦІ

СІРОЦІНА. **(Спец. кар. «Звязды»).** У мінулым годзе ў раёне дрэнна была арганізавана ўборка сенажаці і закладка сіласу. У радзе калгасаў на закупку кармоў для жывёлы траціліся вялікія сродкі. Так, калгас «Чырвоны пуцілавец», Шумілінскага сельсовета, на закупку кармоў расходаваў каля 10 тысяч рублёў А ў гэтым калгасе былі ўсе ўмовы поўнасцю забяспечыць жывёлу сваімі кармамі.

Мінулагодняя практыка паўтараецца і сёлета. У гэтым-жа калгасе яшчэ не ўбралі 130 гектараў сенажаці, зрываецца сіласаванне кармоў. Ёсць факты, калі сенажаць разбазарваецца. Так, калгаснік І. Ф. Васілеўскі скасіў для сябе 4 гектары калгаснай сенажаці. Да парушальніка калгаснага статута меры не прыняты.

Зацяжку ўборкі сенажаці старшыня калгаса тав. Красоўскі імкнецца апраўдаць тым, што ў калгасе мала рабочых рук. Сцвярджэнні старшыні беспадстаўны. У арцелі больш 20 калгасніц зусім не выходзяць на работу. Да іх адносяцца Васілеўская, Гінтовіч, Севасцянава, Карпава, Акунёва і інш.

Не змагаюцца за стварэнне моцнай кармавай базы і калгасы «Першага мая», Андросаўскага сельсовета, «Маяк соцыялізма», Шумілінскага сельсовета, і многія іншыя.

В. АНАНІЧ.

Удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі — загадчык аўцафермай калгаса «Шлях соцыялізма» (Чэрыкаўскі раён, Магілеўскай вобласці) М. Г. Батура (другі справа), вярнуўшыся з Масквы, расказвае аб выстаўцы стаханаўцам-жывёлаводам, удзельнікам абласной нарады па жывёлагадоўлі. Фото А. Н. Розельмана. (Фотахроніка БЕЛТА).

УДЗЕЛЬНІКІ ВЕЛАПРАБЕГУ СОПКА ЗААЗЁРНАЯ—ЗАХОДНЯЯ ГРАНІЦА—У БССР

ВІЦЕБСК, 24 жніўня. **(Ад наш. спец. кар.).** Сёння ўдзельнікі велапрабегу сопка Заазёрная—Заходняя граніца прыбылі у БССР. Першая сустрэча працоўных рэспублікі з адважнымі веласіпедыстамі адбылася каля дома адпачынку «Чырвоны кастрычнік» на тэрыторыі Лёзнянскага раёна БССР. На адбыўшымся тут мітынгу выступіў камандор прабегу тав. А. Е. Цімохаў.

Ён перадаў гарачае прывітанне працоўным ордэнаноснай Совецкай Беларусі ад працоўных Прыморскага і Хабараўскага краёў і ад зоркіх вартавых сопкі Заазёрная. Пасля кароткага адпачынку веласіпедысты накіраваліся да Віцебска, дзе іх чакалі каля 10 тысяч працоўных. Рабочыя калектывы завода імені Кірава і акулярнай фабрыкі прыйшлі ў прэзідыум-вагазах. Грудзі многіх упрыгожваюць абаронныя значкі.

17 гадзін. Здалёк паяўляюцца адважныя веласіпедысты. Насустрач ім нясуцца бадзёрыя гукі духавых аркестраў, выконваючых любімую песню «Масква-майская».

Мітынг, прысвечаны слаўнаму велапрабегу, адкрывае сакратар абкома комсамола тав. Князеў.

— Мы рады,—гаворыць ён,—вітаць у сябе таварышоў, якія былі ўдзельнікамі гераічных падзей ля возера Хасан.

Слаўных веласіпедыстаў вітае намеснік палітрука т. Захожый. Ён заканчвае сваю прамову словамі:

— Мы зорка ахоўваем заходнія рубяжы вялікага Совецкага Саюза. Таксама, як і героі-хасанаўцы мы дадзім рашучы адпор усім, хто пасмее сваёй бруднай нагой ступіць на нашу свяшчэнную зямлю.

Затым з гарачым прывітаннем выступіў сакратар абкома КП(б)Б тав. Гінзбург.

З адказам выступіў тав. Цімохаў, сустрэты бурнай авацыяй.

Перадаўшы гарачае прывітанне працоўным Беларусі ад пагранічнікаў-далёкаўсходнікаў і ад працоўных совецкага Прымор'я, тав. Цімохаў гаворыць:

— 30 мая мы стартавалі ад легендарнай сопкі, дзе наша доблесная Чырвоная Армія разбіла японскіх самураяў. Ад месца старта да Віцебска мы прайшлі 10.800 кіламетраў. Ні бездарожжа, ні горы, балоты, лясы не маглі зламіць нашай волі да перамогі, не было для нас перашкодай, бо мы з'яўляемся выхаванцамі нашай доблеснай Чырвонай Арміі, сынамі совецкага народа. Нас выхавала партыя Леніна—Сталіна, Ленінска-Сталінскі комсамол.

25 жніўня ў 6 гадзін раніцы хасанаўцы-веласіпедысты накіраваліся па далейшаму маршруту—Орша, Магілеў, Мінск, Негарэлае.

З. ЛАРЫСАЎ У. КАЛЫМАГА.

**
*

ОРША. Працоўныя Оршы сустракалі сёння адважных веласіпедыстаў-хасанаўцаў, якія робяць прабег па маршруту сопка Заазёрная — Заходняя граніца. На цэнтральную вуліцу сустракаць удзельнікаў велапрабегу вышла каля трох тысяч працоўных горада.

У 11 гадзін 10 мінут веласіпедысты прыбылі к гарадскому саду «Дынама».

Адбыўся мітынг, на якім выступілі — сакратар райкома партыі тав. Калеснікаў і сакратар райкома комсамола тав. Каратkoў.

МАГІЛЕЎ, 25 жніўня. (БЕЛТА). Сёння ў 17 гадзін 30 мінут у Магілеў прыбылі адважныя хасанаўцы-веласіпедысты.

Працоўныя Магілева цёпла сустрэлі ўдзельнікаў бяспрыкладнага велапрабегу. На Аршанскім шасе ля мясакамбіната адбыўся мітынг, на якім прысутнічала каля 3.000 чалавек.

За 87 дзён слаўныя веласіпедысты прайшлі 11.000 кіламетраў. Усе машыны спраўныя. Веласіпедысты — бадзёрыя і здаровыя. У 5 гадзін 30 мінут раніцы 26 жніўня яны стартуюць на Мінск.

АД УСХОДНЯЙ ДА ЗАХОДНЯЙ ГРАНІЦ

На вяршыні сопкі Заазёрнай горда развіваецца прапоры кулямі чырвоны сцяг, узвігнуты Героем Совецкага Саюза тав. Машляком.

Адсюль 30 мая ў 15 гадзін, цёпла суправаджаемыя слаўнымі пагранічнікамі, мы стартавалі ў далёкі шлях, трымаючы курс на заходнюю граніцу.

Пачынаючы свой вялікі прабег, наша пяцёрка ясна ўяўляла ўсю труднасць узятай на сябе задачы, але мы—большэвікі, выхаваныя партыяй Леніна — Сталіна і Ленінскім комсамолам, смела і ўпэўнена ішлі да вызначанай мэты.

Самы цяжкі шлях нам прадстаяла прайсці ад Хабараўска да станцыі Бушалей. Ішлі праліўныя дажджы, дарога распаўзлася. Усю гэтую адлегласць — каля 2.000 кіламетраў нам прышлося прайсці пехатой.

Такія-ж труднасці мы пераадалявалі, праязджаючы Байкал. 200 кіламетраў ішлі па схілах крутых гор і палатну чыгункі.

У Барабінскіх стэпах, паміж Омскам і Новасібірскам на адлегласці 300 кіламетраў мы сустракалі размытыя стэпавыя дарогі. І там таксама не мелі магчымасці сесці на машыны.

Але мы бадзёра, кіламетр за кіламетрам прадаўжалі свой маршрут. Ад аднаго сазнання, што набліжаемся да сэрца радзімы—прыгажуні Масквы, у нас уліваліся новыя сілы, нашы совецкія веламашыны развівалі ўсё большую скорасць.

17 жніўня, у 17 гадзін, Масква нас радушна прыняла ў свае абдымкі.

Дзесяткі тысяч масквічоў бурна апладыравалі, калі мы, у часе перарыву футбольнага матча, паявіліся на беговай дарожцы стадыёна «Дынамо». З радасцю рапартавалі мы роднай сталіцы, што далёкі шлях ад сопкі Заазёрнай пройдзен за 77 хадавых дзён.

Мне ўспамінаецца велапрабег Комсамольск—Масква ў 1937 годзе, які я ўзначальваў. Шлях ад Валачаеўкі да Масквы (9.200 кіламетраў) мы тады прайшлі за 81 дзень. Зараз гэта адлегласць пройдзена намі ўсяго толькі за 72 дні.

2 дні, праведзеныя ў Маскве, пакінулі ў нас незабыўнае ўражанне.

Мы прынялі ўдзел у любімым традыцыйным свяце совецкага народа — дні Авіяцыі, захапляліся паветраным парадам у Тушыно.

Назаўтра з вялікай цікавасцю агледзелі Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку, якая ярка адлюстроўвае грандыёзныя поспехі сельскай гаспадаркі нашай краіны. Дэтальна азнаёміліся з павільёнамі Далёкага Усхода і БССР, прымалі ўдзел у сустрэчы экскурсантаў Далёкага Усхода і БССР.

Развітваліся мы з Масквой у Цэнтральным парку культуры і адпачынку імені Горкага, адкуль 20 жніўня, ў 20 гадзін, стартавалі на Расладзь—Смаленск.

Самая цяжкая дарога асталася з-заду. За 2,5 дня мы пакрылі 510 кіламетраў, прыбыўшы ў Смаленск 23 жніўня, на восем сутак раней намечанага графіка.

Са Смаленска стартавалі 24 жніўня, у 9 гадзін раніцы, а ў 12 гадзін 30 мінут уступілі на беларускую зямлю. У гэты-ж дзень, у 18 гадзін, прыбылі ў Віцебск.

Пройдзены шлях ужо складае 10 800 кіламетраў. Мы бадзёры, здаровы і ўпэўнены, што прыдзем к фінішу—станцыя Негарэлае—27 жніўня.

Дзе мы толькі не праязджалі — у гарадах і сёлах, нас прымалі як дарагіх гасцей.

Скрозь і ўсюды мы бачылі квітнеючыя гарады і сёлы, гіганты—фабрыкі і заводы, багатыя калгасныя палі, шчаслівых совецкіх людзей, заўсёды гатовых стаць грудзьмі на абарону любімай маці-радзімы.

Мае чатыры прыяцелі, удзельнікі прабегу тт. Гогалеў, Кошэлеў, Баканаў і Федасееў храбра біліся з японскімі самураямі ля возера Хасан. Тры з іх працуюць плотнікамі завода імені Кагановіча ў Хабараўску. Усе яны комсамольцы. Нядаўна т. Кошэлева прынялі ў кандыдаты партыі. Тав. Федасееў двойчы ранены ў баі, узнагароджан ордэнам «Красной Звезды». Ён працуе разам са мной на машынабудаўнічым заводзе ў Комсамольску. Перад стартам ён падаў заяву аб прыёме ў рады большэвіцкай партыі.

Поспехам мы абавязаны вялікаму Сталіну, імя якога натхняла і натхняе ўсіх нас на гераічныя справы, у імя нашай слаўнай радзімы.

Гарачае большэвіцкае прывітанне працоўным ордэнаноснай Беларусі ад рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыі Прыамурскага і Хабараўскага краёў, ад пагранічнікаў Хасанаўскага раёна, сопкі Заазёрная.

Яшчэ шырэй разгорнем соцыялістычнае спаборніцтва паміж двума вялікімі фарпостамі Совецкага Саюза на лепшую пастаноўку масава-абароннай работы.

Гарачае прывітанне пільным вартавым заходніх рубяжоў.

Антон Ефімавіч ЦІМОХАЎ — камандор і палітрук велапрабегу сопка Заазёрная — Заходняя граніца.

Віцебск, 24 жніўня.

НА ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ

ШТО МНЕ ДАЛА ВЫСТАЎКА

Мне з групай прадстаўнікоў сельскай гаспадаркі нашага раёна выпала шчасце пабываць на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Пяць дзён агляду павільёнаў выстаўкі — пяць дзён падарожжа па неабсяжных прасторах нашай квітнеючай радзімы. Багацце нашых калгасаў, поспехі і дасягненні перадавікоў дэманструюцца тут. Усё так прыгожа, захапляюча, што не заўважаеш, як ляціць час, хочацца падоўгу хадзіць па гэтаму цудоўнаму гораду.

За пяць дзён, праведзеных на выстаўцы, я імкнулася як мага больш пазнаёміцца з пладамі работы лепшых людзей нашай радзімы, вывучыць іх вопыт, каб скарыстаць яго непасрэдна ў нашым калгасе. А вывучаць ёсць што. Выстаўка — гэта не толькі дэманстрацыя дасягненняў, а і школа стаханаўскага вопыту. Тут паказана, як людзі атрымліваюць высокія ўраджаі, удоі і т. д.

Больш усяго мяне цікавіў павільён нашай ордэнаноснай рэспублікі і экспанаты ільнаводчых калгасаў і звенняў. На відным месцы выстаўлены і мае экспанаты ільну 18 нумару, мой партрэт. Насупраць — экспанаты і партрэт Сашы Хамяковай. Я пазнаёмілася з ёй, распытала, як яна працуе, якіх дабілася паказальнікаў. Расказала ёй і аб сваёй рабоце. Праўда, у Хамяковай ураджай быў крыху ніжэй, аднак у яе ёсць чаму вучыцца. Яна мне расказала, што ў сухое надвор'е, калі лён вылежваецца доўга, яна дамачвае яго, гэтым значна скарачаецца вылежка, паляпшаецца якасць валакна.

Вельмі прыгожы лён Анастасіі Машкаровай (Талачынскі раён). Ён чысты, мяккі і вельмі доўгі — 24 нумару. Сёлета Машкарова ўзяла абавязацельства атрымаць на плошчы ў 0,5 гектара лён 26 нумара. Гэта падзадорыла мяне, і я тут-жа на выстаўцы рашыла здаць частку валакна таксама 26 нумарам і не менш 10 цэнтнераў з гектара.

У гэтым годзе наш калгас засеяў 40 гектараў ільну. Лён вырас выдатны. Атрымаем у сярэднім па калгасу не менш, як па 6 цэнтнераў валакна з кожнага гектара, а асобныя звенні дадуць больш чым па 10 цэнтнераў. Лён увесь даўно выбран і разаслан. Хутка яго будзем падымаць і прыступаць да апрацоўкі.

Самы лепшы і самы прыгожы лён вырасцілі ільнаводы Калінінскай вобласці. Ад калгасаў гэтай вобласці на выстаўку прадстаўлены экспанаты ільнавалакна 26 і нават 30 нумару. Такога ільну раней я не бачыла. І ўраджаі ў калінінцаў значна лепшыя, чым у нас — да 18 цэнтнераў з гектара і больш.

Я падоўгу распытвала экскурсавода і калінінцаў, як атрымаць такі выдатны лён. Лён трэба сеяць па канюшыніішчу, старанна ўгнойваць глебу, узорна даглядаць пасевы. Церабленне і малацьбу ільну калінінцы праводзяць толькі машынамі. Трасту не сцеляць, як гэта робім мы, а мочаць. Ад гэтага павышаецца якасць валакна — яно становіцца надзвычай белым і мягкім. Апрацоўваюць валакно таксама машынамі.

Да сёлетняга года мы апрацоўвалі валакно толькі ўручную, аб мочцы ільну нават і не думалі. Зараз будзем рабіць не так. Лён будзем мачыць, апрацоўваць будзем машынамі (нядаўна мы атрымалі машыну Антонава).

На выстаўцы захапляешся ўсім. Цудоўныя экспанаты ўсіх павільёнаў. Я доўга знаходзілася ў павільёне «Жывёлагадоўля». Якія там каровы, свінні, авечкі! Чаму нам не мець такіх-жа? Тут прадстаўлены каровы, якія даюць па 68 літраў малака за дзень, а нашы даюць у 5—6 разоў менш. Чаму-ж гэта так? Я ўважліва агледзела МТФ, якая прадстаўлена на выстаўцы, і зразумела, што вінаваты толькі мы — калгаснікі. Мы яшчэ не ўмеем даглядаць кароў. У нас даяркі толькі доюць кароў, а даглядаюць іх другія. Каровы стаяць на гнаі, няма станкоў. А ў людзей-жа інакш, лепш. У кароўніку цэментная падлога, нароблены жолабкі для стоку гноевай жыжы, для кожнай каровы станок. Кожны дзень мяняецца падсцілка, кароў даглядаюць і доюць даяркі.

Так будзе і ў нашым калгасе. Нашу МТФ абсталюем так, як паказана на выстаўцы. Для гэтага ў нас ёсць усе магчымасці, а галоўнае — ёсць людзі, якія ведаюць і любяць сваю справу. Наша даглядчыца цялят Ефрасінія Камека сёлета вытадавала ўсіх 29 цялят. Усе цяляты здаровыя, сытыя, хутка прыбываюць у вазе.

Прыдзецца як належыць перабудаваць работу і нашай свінагадоўчай фермы. На ферме ў нас пакуль што няма парадку, ферма прыносіць зусім мала даходу. А на выстаўцы паказаны фермы, якія прыносяць сотні тысяч рублёў прыбытку. Трэба і нам раўняцца па іх.

Нельга абыйсці і садаводства. Я пабывала ў цудоўным мічурынскім садзе, пазнаёмілася з выдатнымі работамі вялікага пераўтваральніка прыроды Мічурына. Чаго тут толькі няма! Тут і яблыкі, слівы, абрыкосы, мандарыны, апельсіны, вінаград і многа, многа іншых пладоў. Тут ёсць яблыні, якія сцеляцца па зямлі, як кавуны або дыні.

Я доўга любавалася вінаградам. На выстаўцы яго прадстаўлена многа сартоў. Ёсць экспанаты і з БССР. Чаму-б гэта і ў нашым калгасе не завесці вінаграднік? У другіх-жа калгасах ён расце, будзе расці і ў нас. Я прыкладу ўсе сілы, каб у нас быў свой вінаград У гэтым мне дапамогуць усе калгаснікі.

Або чаму-б гэта нам не мець сваю хату-лабараторыю? Усе перадавыя калгасы маюць іх. Трэба, каб раённыя спецыялісты дапамаглі нам арганізаваць сваю хату-лабараторыю. Яна дапаможа ўзняць ураджайнасць нашых палёў.

Аб выстаўцы ўсяго не раскажаш, не апішаш. Трэба патраціць многа часу, каб толькі азнаёміцца з усімі павільёнамі і аддзеламі. Усюды многа новага, незнаёмага. Усё захапляе, пакідае вельмі многа ўражанняў.

Вярнуўшыся дадому ў родны свой калгас, я аб усім, што бачыла на выстаўцы, падрабязна раскажу сваім калгаснікам і калгасніцам — маім выбаршчыкам, навучу іх, як трэба змагацца за высокі ўраджай.

Марыя САРАНЧУК,
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, звеннявая па ільну калгаса «Перамога», Рэчыцкага раёна.

ВІТАЕМ ДАГАВОР ПРАЦОЎНЫХ ДВУХ РУБЯЖОЎ

Калгаснікі і калгасніцы сельскагаспадарчай арцелі імені Куйбышэва, Бабруйскага раёна, з гарачым адабрэннем сустрэлі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва па абароннай рабоце паміж БССР і Далёкім Усходам.

Мы ўжо абмеркавалі дагавор на сходзе партыйна-комсамольскага і абароннага актыва калгаса, на якім прысутнічалі 75 чалавек.

У бліжэйшыя дні мы давядзем дагавор да кожнага калгасніка і калгасніцы. Кожная брыгада, звяно, калгаснік возьмуць канкрэтныя абавязацельствы па паляпшэнню абароннай работы.

Мы намячаем арганізаваць 8 новых абаронных гурткоў, у якіх падрыхтуем к канцу гэтага года 90 значкістаў ППХА. ГСА, варашылаўскіх стралкоў і коннікаў.

Ствараем куток абароны ў калгасным клубе, у якім будзем праводзіць усю масавую работу. Для кутка набываем процівагазы, мелкакаліберныя вінтоўкі і інш.

У калгасе абсталёўваем дзве спартыўныя пляцоўкі, на якіх юнакі і дзяўчаты будуць здаваць нормы на значок ГПА.

Наша пярвічная асоавіяхімаўская арганізацыя яднае 195 членаў таварыства. Мы ставім сваёй задачай уцягнуць у рады Асоавіяхіма не менш 75 процантаў усіх калгаснікаў. Тры дні ў месяц мы прысвяцім абароннай рабоце. У гэтыя дні будуць адбывацца сходы асоавіяхімаўцаў, трэніроўка калгаснікаў у процівагазах, а таксама масавая здача норм на абаронныя значкі.

Наш калгас мае нямалы абаронны актыў—25 лепшых калгаснікаў і калгасніц. Сярод іх — комсамольцы Павел Колбан, Іван Урбановіч, беспартыйныя Міхаіл Казакоў, Савелій Свенціцкі, Віктар Старавойтаў, Іван Канавалаў і інш.

Тав. Колбан падрыхтаваў у калгасе 20 варашылаўскіх стралкоў, Казакоў — 4 значкістаў ППХА, Канавалаў — 18 варашылаўскіх коннікаў. Яны—лепшыя стаханаўцы і ўдарнікі соцыялістычных палёў.

Дагавор натхніў усіх калгаснікаў і калгасніц нашай сельскагаспадарчай арцелі на новыя поспехі ў абароннай рабоце. Мы даб'ёмся таго, каб кожны калгаснік набыў адну з ваенных спецыяльнасцей, навучыўся метка страляць, добра ездзіць на кані, умела дзейнічаць у часе трывогі ППХА.

К. Н. МІНКЕВІЧ,
ордэнаносец, старшыня калгаса імені Куйбышэва, Бабруйскага раёна, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ІНСТРУКТАРЫ ГАРКОМА ПАРТЫІ

У пакоі арганізацыйна-інструктарскага аддзела Віцебскага гаркома КП(б)Б заўсёды ажыўлена. Сюды днём і ўвечары прыходзяць сакратары пярвічных партыйных арганізацый, радавыя камуністы. Усе яны звяртаюцца да інструктараў па розных пытаннях партыйнага жыцця, расказваюць аб сваёй рабоце, многія раяцца па асабістых справах.

У аргінструктарскім аддзеле разам з загадчыкам чатыры работнікі. Аддзелам кіруе т. Масарскі, які мае практычны вопыт партыйнай работы: на працягу пяці год ён працаваў інструктарам райкома партыі. Інструктарамі таксама падабраны таварышы, знаёмыя з партыйным жыццём. Тав. Гіндзіна, напрыклад, была намеснікам сакратара партыйнай арганізацыі буйнейшага ў рэспубліцы прадпрыемства — фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», т. Міхайлоўская доўгі час працавала інструктарам Полацкага райкома партыі. Растучым партыйным работнікам з'яўляецца трэці інструктар аддзела т. Фідэльман.

Са стварэннем новага аддзела зусім па іншаму разгарнулася практычная работа інструктараў. Да XVIII з'езда партыі інструктары гаркома былі слаба звязаны з пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі не ведалі запытанняў камуністаў, зачастую стаялі ў баку ад арганізацыйных пытанняў, работа іх праходзіла бясланава, бессістэмна.

Зараз аргінструктарскі аддзел распрацоўвае канкрэтны план сваёй работы, на аснове якога кожны інструктар складае план сваіх дзеянняў. Інструктары трымаюць цесную сувязь з партарганізацыямі прадпрыемстваў, устаноў і навучальных устаноў, дапамагаюць ім у практычнай рабоце.

Сур'ёзную ўвагу аддаюць інструктары прыёму ў партыю. Перад тым, як бюро гаркома разглядае кандыдатуры таварышаў, прынятых у партыю пярвічнымі партарганізацыямі, інструктары папярэдне знаёмяцца з імі, вывучаюць іх палітычны твар і дзелавыя якасці. Так, напрыклад, інструктар т. Фідэльман выявіў, што прынятая ў кандыдаты партыі пярвічнай партарганізацыяй фабрыкі імені Клары Цэткін С... утоіла ад партыі, што бацькі яе былі пазбаўлены выбарчых праў. Гаркам партыі не зацвердзіў рашэнне пярвічнай партарганізацыі аб прыняцці С... у партыю.

Інструктары сістэматычна правяраюць, як нізавыя партарганізацыі кіруюць гаспадарчай дзейнасцю прадпрыемстваў. Нядаўна такая праверка была праведзена на ільнапрадзільнай фабрыцы імені Кагановіча, заводзе «Камінтэрн» і інструментальна-мэблевай фабрыцы. Вынікі праверкі абмеркаваны на партыйных сходах на прадпрыемствах і на бюро гаркома з удзелам камуністаў інжынерна-тэхнічных работнікаў і стаханаўцаў. Зараз інструктары правяраюць, як партарганізацыі выконваюць рашэнні гаркома.

Практыкуецца перыядычнае скліканне нарад сакратароў пярвічных партарганізацый і радавых камуністаў па розных пытаннях партыйнага будаўніцтва. Інструктар т. Гіндзіна правяла нараду камуністаў-медработнікаў, на якой абмеркавана становішча аховы здароўя ў горадзе. У падрыхтоўцы нарады прымала ўдзел 65 камуністаў-медработнікаў. 19 жніўня інструктар т. Міхайлоўская правяла нараду сакратароў партарганізацый і камуністаў—дырэктараў сярэдніх школ аб сустрэчы новага вучэбнага года.

Каб практычна дапамагчы рабоце пярвічных партарганізацый аргінструктарскі аддзел практыкуе правядзенне нарад непасрэдна на прадпрыемствах, ва ўстановах і навучальных установах. Так, на фабрыцы імені Кагановіча, «Сцяг індустрыялізацыі» і імені Клары Цэткін праведзена нарада парторгаў цэхаў па пытанню аб складанні плана партыйнай работы і мерапрыемствах, якія забяспечваюць яго выкананне.

Зараз інструктары падрыхтоўваюць на чарговых пасяджэнняў бюро гаркома такія пытанні, як парткіраўніцтва камсамолам і выкананне пастановы ЦК ВКП(б), СНК СССР і ВЦСПС аб упарадкаванні працоўнай дысцыпліны.

Для лепшага абслугоўвання пярвічных партарганізацый пры аддзеле створан інстытут пазаштатных інструктараў у колькасці 18 чалавек. За кароткі перыяд таварышы паспелі аказаць значную дапамогу партарганізацыям. Так, пазаштатны інструктар т. Прышчэпаў праверыў работу з кандыдатамі партыі ў партарганізацыі таракамбіната. Ускрытыя ім недахопы былі абмеркаваны на сходзе камуністаў камбіната. Рад пазаштатных інструктараў прыцягваецца да расследвання асабістых спраў камуністаў — скаргаў, апеляцый і т. д.

Трэба адзначыць таксама і рад істотных недахопаў у рабоце аргінструктарскага аддзела гаркома. Аддзел яшчэ поўнасцю не ўкамплектован работнікамі: нехапае намесніка загадчыка аддзела, аднаго інструктара і партінфарматара. Адсутнасць партінфарматара асабліва сказваецца на ўсёй рабоце гаркома партыі.

У рабоце інструктараў яшчэ ёсць элементы неарганізаванасці. Таварышы не навучыліся правільна арганізоўваць свой рабочы дзень, многа часу знаходзяцца ў самым гаркоме, як след не наладжан прыём наведвальнікаў. Можна зачастую назіраць, як інструктар адначасова гутарыць з некалькімі таварышамі. Ясна, што пры такой гутарцы наведвальнікі не атрымліваюць вычарпальных адказаў.

Адсутнасць агульнага плана работы гаркома партыі адмоўна ўплывае на работу ўсіх аддзелаў. Інструктараў вельмі рэдка склікаюць для абмену вопытам, іх мала вучаць майстэрству партыйнага кіраўніцтва.

З. ЛАРЫСАЎ,
У. КАЛЫМАГА.

У новаўтвораным Калінкавіцкім раёне, Палескай вобласці, разгарнулася дзейная падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных БССР. НА ЗДЫМКУ: кіраўнік агіткалектыва Юр'евіцкага сельсовета, дырэктар школы А. Г. Шульга (першы справа) разам з агітатарамі і сельскім актывам абмяркоўваюць план агітмасавай работы.
Фото Б. М. Хеніна (фотахроніка БЕЛТА).

ЯК НЕЛЬГА ФАРМІРАВАЦЬ ГУРТКІ

У пастанове ЦК ВКП(б) аб партыйнай прапагандзе зусім ясна вызначана, як трэба арганізаваць гурткі па вывучэнню гісторыі партыі.

ЦК ВКП(б) прызнаў мэтазгодным мець тры тыпы гурткоў, у адпаведнасці з дыферэнцыяваным характарам вывучэння «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», гурткі для нізавога, сярэдняга звяна нашых кадраў і для больш падрыхтаваных таварышаў.

У Лепельскім раёне парушылі гэтыя ўказанні ЦК ВКП(б). Узяць, напрыклад, гурток па вывучэнню гісторыі партыі пры першай Лепельскай МТС. Ён быў арганізаван невядома для якога звяна. У гуртку лічыцца 17 чалавек. Замест таго, каб забяспечыць больш аднародны па ўзроўню падрыхтоўкі састаў гуртка, у яго механічна запісалі ўсіх работнікаў МТС. Тут аказаліся інжынер-механік МТС тав. Кулікаў і інжынер Якімаў — людзі з вышэйшай асветай, тры таварышы, якія маюць сярэднюю асвету, два, — скончыўшыя соўпартшколу, і разам з імі таварышы, якія маюць асвету за два—тры класы сельскай школы. Гурток гэты ні разу не збіраўся і толькі лічыцца на паперы. Кіраўніком гуртка з'яўляецца тав. Шалак, — пазаштатны прапагандыст райкома КП(б)Б, ён-жа намеснік дырэктара МТС па палітчасці і сакратар пярвічнай партарганізацыі.

Ёсць яшчэ гурток для нізавога звяна ў Каменскім сельсовеце. Кіраўніком гуртка вылучан штатны прапагандыст райкома партыі тав. Юдовін. У саставе гуртка 20 чалавек — 6 старшынь калгасаў, 1 рахункавод, 1 брыгадзір, 1 рабочы ільназавода, 3 радавыя калгаснікі. Разам з гэтымі таварышамі ў гурток увайшлі: дырэктар маслазавода, дырэктар і намеснік дырэктара МТС, заатэхнік, аграном, старшыня сельсовета і старшыня сельпо. Сярод слухачоў гуртка 7 членаў партыі, 10 кандыдатаў партыі, 2 камсамольцы і адзін беспартыйны. Наўрад ці ў гэтым гуртку забяспечан аднародны ўзровень агульнаадукацыйнай і палітычнай падрыхтоўкі слухачоў.

У няправільна сфарміраваных гуртках ніяк не наладзяцца нармальныя заняткі. У гуртку для сярэдняга звяна пры райпарткабінеце (кіраўнік — штатны прапагандыст Лепельскага райкома партыі т. Забранскі) лічыцца па спіску 15 чалавек. Усе члены і кандыдаты партыі — кіруючыя работнікі раённых савецкіх і гаспадарчых устаноў. Заняткі ўстаноўлены два разы ў месяц. Аднак за ўвесь час было толькі 4 заняткаў, і на іх слухачы ў поўным саставе ні разу не прысутнічалі.

У маі адбыліся першыя заняткі гуртка па гісторыі партыі (для сярэдняга звяна) пры пярвічнай партарганізацыі чыгуначнай ст. Лепель. Заняткі намечана праводзіць тры разы ў месяц. Учот наведвання тут не вядзецца, але з гутаркі з тав. Нікіціным — кіраўніком гуртка (ён-жа сакратар пярвічнай партарганізацыі ст. Лепель) выяснілася, што з 10 членаў гуртка 3 ні разу не былі на занятках, а пастаянна гурток наведваюць не больш 4—5 чалавек. За тры месяцы адбылося трое заняткаў (апошнія былі 10 ліпеня). У рэзультаце слухачы паспелі вывучыць толькі першы раздзел. Цікава, што сам прапагандыст тав. Нікіцін не «адстае» ад гуртка і зараз вывучае першы падраздзел другога раздзела «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Такі фактычны стан гурткоў.

Ці не ясна з гэтага, што райком партыі не ведае і не цікавіцца работай гурткоў?

Не лепш у раённай партарганізацыі і з самастойным вывучэннем гісторыі партыі. Толькі каля 30 проц. усяго састава райпартарганізацыі прыступіла да вучобы і вывучаюць пакуль першы, другі, трэці раздзелы. Сур'ёзна вучацца не больш 25—30 чалавек. Сакратар пярвічнай партарганізацыі райвыканкома тав. Гербачык не лічыць сваім абавязкам кіраваць партыйнай прапагандай. Ён кажа:

«Усе камуністы — людзі свядомыя, ведаюць, што трэба вывучаць гісторыю партыі, і няхай вывучаюць, а тое, што яны не вучацца, я не вінават».

З далейшай гутаркі выяснілася, што і сам сакратар пярвічнай партарганізацыі райвыканкома вывучае пакуль што трэці раздзел. Зразумела, што ён не можа большага патрабаваць ад іншых членаў партыі.

Многія кіраўнікі пярвічных партарганізацый забываюць патрабаванне статута ВКП(б), прынятага на XVIII з'ездзе партыі, у якім ясна ўказваецца, што кожны камуніст павінен і абавязан «няўстанна працаваць над павышэннем сваёй свядомасці, над усваеннем асноў марксізма-ленінізма». Сістэматычна правяраць, як выконваюць камуністы гэтае патрабаванне статута партыі, — прамы абавязак кіраўнікоў партарганізацый.

Б. ЗЕЛЬЦЭР.

3 ТЫСЯЧЫ НОВЫХ АГІТАТАРАЎ

Партыйныя арганізацыі Беларускай чыгункі разгарнулі вялікую работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Палітаддзел Асіпавіцкага аддзялення вылучыў дадаткова 105 агітатараў, якія прыступілі да раз'яснення Палажэння аб выбарах. 140 агітатараў прайшлі семінар, дзе яны азнаёміліся з матэрыяламі другой Сесіі Вярхоўнага Совета БССР і з выбарчым законам.

Партыйныя арганізацыі Калінкавіцкага вузла правялі масавыя сходы рабочых, служачых і хатніх гаспадынь. Многія агітатары прыступілі ўжо да раз'яснення выбарчага закона сярод насельніцтва. Агітатар дэпо Калінкавічы тав. Хамякоў умела спалучае раз'ясненне Палажэння аб выбарах з мабілізацыяй мас на барацьбу за паляпшэнне вытворчай работы.

Добрую ініцыятыву праявіла партыйная арганізацыя станцыі Гомель. Днямі яна арганізавала першы сход выбаршчыкаў 8 участка г. Гомеля. Прысутныя з вялікай увагай праслухалі даклад аб прадстаячых выбарах, прад'явілі рад патрабаванняў партарганізацыі станцыі.

Днямі ў палітаддзеле чыгункі адбылася нарада па пытанню падрыхтоўкі да прадстаячых выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Намечан рад практычных мерапрыемстваў. Каля трох тысяч новых агітатараў вылучаецца для раз'яснення выбарчага закона.

На вакзалах, у клубах і чырвоных кутках, у парткабінетах арганізуюцца сталы справак і кансультацый па выбарчаму закону. У верасні намечана правесці дарожную нараду агітатараў.

Р. СЫРКІН.

УСЯМЕРНА РАЗВІВАЦЬ МЯСЦОВУЮ ХАРЧОВУЮ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

БЕЗІНІЦЫЯТЫУНЫЯ КІРАУНІКІ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). XVIII з'езд ВКП(б) прыняў рашэнне аб усямерным развіцці харчовай прамысловасці ў кожнай рэспубліцы, вобласці і ў кожным краі.

У сваім дакладзе таварыш В. М. Молатаў сказаў: «...У кожнай рэспубліцы, у кожным краі і вобласці павінны вырабляцца такія прадукты харчавання, спажываемыя ўсюды ў вялікай колькасці, як бульба, гародніна, малочныя прадукты, мука, кандытарскія вырабы, піва, а таксама такія прамысловыя вырабы, як галантарэя, вырабы швейнай прамысловасці, мэбля, цэгла, вапна і т. д...».

Стварэнне ў раённых цэнтрах, сёлах, калгасах невялікіх прадпрыемстваў, вырабляючых прадукты харчавання на базе мясцовай сыравіны, дасць магчымасць шырэй задавальняць растучыя запросы савецкага спажыўца.

Гомельская вобласць мае даволі добрую базу для развіцця мясцовай харчовай прамысловасці. Лясы тут багаты дзікарастучымі ягадамі (брусніцы, суніцы), ёсць многа парэчак і маліны, грыбоў, жолудаў. У многіх раёнах — Рагачоўскім, Рэчыцкім, Веткаўскім і ў іншых — ёсць вялікія сады з рознымі сартамі яблык, груш, вішань і іншых пладоў. Вобласць выключна багата вадаёмамі, дзе можна развіваць рыбную гаспадарку.

Усе гэтыя багатыя рэсурсы можна з поспехам выкарыстаць для выпрацоўкі безалкагольных напіткаў, павідла, варэння, кандытарскіх вырабаў, кофе, воцата, марынаваных грыбоў і т. д.

На раённых нарадах гаспадарчага актыва, якія тут нядаўна адбыліся, аб гэтым многа гаварылі. Удзельнікі нарады ўнеслі каштоўныя прапановы аб рацыянальным выкарыстанні мясцовай сыравіны.

На жаль, да гэтага часу рашэнні нарад ні ў адным раёне не рэалізуюцца.

У Гомелі, як і ў іншых абласных цэнтрах, існуе Аблхарчпром. На яго непасрэдна ўскладзена задача — шырока развіваць мясцовую харчовую прамысловасць. Ён павінен аператыўна кіраваць раённымі прадпрыемствамі, быць у курсе іх работы, ведаць іх патрэбы, своечасова дапамагаць ім.

Кіраўнікі гомельскага Аблхарчпрома (начальнік тав. Берсон) не зразумелі сваіх функцый. Яны адразу-ж патрабавалі ад Наркамата харчовай прамысловасці стварыць ім базу, г. зн. перадаць у іх веданне буйнейшыя прадпрыемствы харчовай прамысловасці, якія маюць рэспубліканскае значэнне. Калі Наркамат указаў на бяссэнснасць гэтага патрабавання, у тав. Берсона і ў іншых адказных работнікаў Аблхарчпрома паявіліся ліквідатарскія настроі. Пачаліся разгаворы — нам, моў, няма чаго рабіць, мы з'яўляемся нейкай непатрэбнай надбудовай, у якой зусім не адчуваюць патрэбы.

За 16 месяцаў сваёй «дзейнасці» работнікі Аблхарчпрома абследавалі некалькі раённых хлебапякарань, акуратна прышывалі да справы інструкцыі ад наркамата і трэстаў, закідвалі вышэйстаячыя савецкія, партыйныя арганізацыі дакладнымі запіскамі аб бескарыснасці існавання Аблхарчпрома і з дня на дзень чакалі... ліквідацыі.

Праўда, нейкую «ініцыятыву» праявіў тав. Берсон. На працягу паўгоддзя ён дабіваўся перадачы ў яго веданне цэха па выпрацоўцы мінеральных вод кандытарскага камбіната «Спартак». Дзесяткі камісій марнавалі каштоўны час для высвятлення магчымасці адгарадзіць гэты цэх ад тэрыторыі камбіната. Гэта непатрэбная, шкодная зацея каштавала дзяржаве нямала сродкаў. Непасрэдным-жа кіраўніцтвам прадпрыемствамі на месцах ніхто не займаўся.

Між тым, у большасці раёнаў Гомельскай вобласці мясцовая харчовая прамысловасць не развіта. У такіх раёнах, як Чачэрскі, Свяцілавіцкі, Церахаўскі, Уваравіцкі, Журавіцкі і інш. не знайсці ні булачных, ні кандытарскіх вырабаў, ні безалкагольных напіткаў. У гэтыя і іншыя раёны прыходзіцца завазіць з Гомеля розныя прадукты і тавары, выпрацоўку якіх з поспехам можна было-б арганізаваць на месцы. Вось аб чым павінны былі падумаць работнікі Аблхарчпрома.

Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы для росквіту мясцовай харчовай прамысловасці. Шырокае фінансіраванне і крэдытаванне Дзяржаўным банкам раённых прадпрыемстваў забяспечвае ім устойлівую матэрыяльную базу. Праяўляй толькі ініцыятыву і разумна скарыстоўвай крэдыты!

Н. ГІРШЫН,
І. ВАСІЛЬКОЎ.

БАГАТЫЯ РЭСУРСЫ

Плешчаніцкі раён мае вялікія рэсурсы для развіцця мясцовай прамысловасці. Але яны скарыстоўваюцца ў нязначным памеры. Райспажыўсаюз і іншыя арганізацыі завозяць з Мінска і Барысава многа тавараў і прадметаў (мэблю, цэглу, вапну, коламазь і інш.), якія з поспехам можна выраблаць на месцы.

Мясцовы цагельны завод выпускае 750 тысяч цаглін за сезон, а патрэбнасць у гэтым будаўнічым матэрыяле — 2 мільёны штук. Далёка не задавальняе попыт раёна і вапнавы завод. Між тым у Запольскім, Акцябрскім і іншых сельсаветах залягае многа глін і вапны, на базе якіх можна пабудаваць невялікія прадпрыемствы.

Калгасы адчуваюць вялікую патрэбу ў калёсах, санях, дугах і іншым сельскагаспадарчым інвентары. У раёне ёсць дастаткова лесаматэрыялу для вырабу такога інвентара. За арганізацыю сельскагаспадарчай майстэрні пакуль што ніхто не бярэцца.

У веданні плешчаніцкай лесахімічнай арцелі імені Сталіна ёсць некалькі спіртапарашковых і смалакураных заводаў. Тут свабодна можна арганізаваць і выраб коламазі.

Дзесяткі аўтамашын можна было-б вызваліць ад лішніх перавозак, калі-б у раёне па-бальшавіцку ўзяліся за скарыстанне мясцовых рэсурсаў. Прывядзем характэрны прыклад. Райзаготзэрно адпраўляе сотні тон збожжа з Плешчаніц у г. Барысаў. Там яго мелюць на розныя сарты і затым зноў завозяць муку ў Плешчаніцы. На перавозку зярна і мукі ў Барысаў і назад у Плешчаніцы толькі райзаготзэрно і райспажыўсаюз трацяць штогод больш 300 тысяч рублёў. Гэта робяць нібы з-за адсутнасці млына. Між тым за адзін кілометр ад Плешчаніц знаходзіцца млын «Рудня», у якім ёсць вальцы для памолу зярна на розныя сарты. Але нехапае энергіі для поўнага іх скарыстання. Трэба ўстанавіць 18-сільны лакамабіль або нафтарухавік, і тады млын зможа поўнасцю перамалоць зярно. Гэта зрабіць не цяжка. Набыццё і ўстаноўка лакамабіля будзе каштаваць не больш 25—30 тысяч рублёў. Дырэктар промкамбіната тав. Хамякоў гаворыць: «Мы-б усё зрабілі, але вось нам не адпускаюць сродкаў».

Лясы раёна багаты рознымі ягадамі, калгасныя сады — яблыкамі, ігрушамі, слівамі, вішнямі і т. д. Колькі можна было-б выпрацаваць павідла, наварыць варэння, насушыць фруктаў для кампоту! Толькі нязначная колькасць фруктаў і ягад загатаўляецца і адпраўляецца на заводы рэспублікі. Асноўная-ж маса не скарыстоўваецца як след. Між іншым варэнне, павідла, кампот і інш. прадукты райспажыўсаюз прывозіць з Мінска.

Ніхто ў раёне не займаецца і арганізацыяй майстэрняў па пашыву і рамонту абутку і адзення. У гарадскім пасёлку ёсць толькі дзве арцелі. У большасці сельсоветаў майстэрняў па пашыву і рамонту абутку і адзення няма.

Пашыўка касцюма, паліто прадаўжаецца ў швейнай арцелі імені Дзержынскага больш месяца.

Райвыканком зусім не займаецца развіццём мясцовай прамысловасці і скарыстаннем мясцовых рэсурсаў. За ўвесь 1939 год на прэзідыуме райвыканкома гэта пытанне ні разу не абмяркоўвалася. Аргкамітэт Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР па Мінскай вобласці прапанаваў правесці нараду актыва гаспадарнікаў па пытанню скарыстання мясцовых рэсурсаў. Але райвыканком палічыў непатрэбным праводзіць такую нараду.

І. МУРАВІЦКІ.

Магазіны гародніны і садавіны... без гародніны

Багаты ўраджай садавіны і гародніны атрымліваюць калгасы нашай рэспублікі ў гэтым годзе. На рынках Мінска калгаснікі кожны дзень прадаюць многа капусты, бульбы, памідораў, яблык, ігруш новага ўраджаю. У той-жа час многія пладовагародні магазіны сталіцы зачастую пустуюць.

Штодзень можна пагдзядаць такі малюнак: да работніка прылаўка звяртаецца пакупнік:

— Адважце, калі ласка, два кілограмы капусты.

— Што вы, капусты? — Ды яе ў нас ужо некалькі дзён няма, — адказвае прадаўшчыца.

— Тады дайце памідораў.

— І памідораў няма.

Пакупнікі жадаюць купіць яблык, ігруш, укропу і інш., але ў магазінах гэтыя прадукты рэдка калі бываюць.

У магазіне № 207 (Совецкая вуліца) часта не бывае ў продажы бульбы, капусты, памідораў, укропу, маласольных агуркоў і фруктаў.

Сістэматычна недаатрымлівае дзесяткі цэнтнераў садавіны і гародніны магазін № 219 (па Ленінскай вуліцы). У выніку план тавараабароту за 20 дзён жніўня ён выканаў толькі на 73 проц.

Пладова-гародныя магазіны Мінгорхарчгандля выканалі ліпеньскі план продажу гародніны толькі на 73.9 проц., а за дзве дэкады жніўня на 72.7 проц.

Прычыны недахопу гародніны ў магазінах сталіцы БССР крыюцца ў выключна дрэннай рабоце загатоўчых арганізацый: Беларускага гандлёвага пладовагародняга трэста і яго мінскай канторы.

План адгрузкі бульбы, гародніны і фруктаў для Мінска сістэматычна зрываецца. Напрыклад, у жніўні павінна быць завезена 400 тон капусты, 164 тоны памідораў, 695 тон бульбы. Завезена-ж на 25 жніўня толькі 104 тоны капусты, 40 тон памідораў, 415 тон бульбы. Яблык і ігруш загатоўлена ўсяго 80 тон пры плане на 1939 г. 1050 тон.

Адгрузка і перавозка загатоўленай гародніны і садавіны арганізавана вельмі дрэнна. На станцыі Цімкавічы ўжо некалькі дзён ляжыць звыш 60 тон бульбы, каля 30 тон агуркоў, 5 тон памідораў, многа капусты, буракоў, морквы. Гародніна псуецца, а загатоўшчыкі не прымаюць мер да яе перавозкі.

Не вывозіцца загатоўленая гародніна з соўгаса «Чырвоны транспартнік», Прыгараднага сельсовета, Мінскага раёна. Там ляжыць каля 10 тон капусты, 40 тон агуркоў і памідораў.

Падобных фактаў можна было прывесці значна больш. Яны паказваюць, наколькі безадказна адносяцца кіраўнікі Беларускага гандлёвага пладовагародняга треста і Белкаапплодагародніны да забеспячэння працоўных сталіцы разнастайным асартыментам высокаякаснай гародніны і садавіны.

А. САЛАУЕУ.

ЗША ПЕРАД ПРЭЗІДЭНЦКІМІ ВЫБАРАМІ

Прэзідэнцкія выбары ў ЗША адбудуцца восенню 1940 года. Аднак перадвыбарчая кампанія пачалася ўжо. Уся краіна абмяркоўвае асноўнае пытанне прадстаячых выбараў: хто будзе кандыдатам на пост прэзідэнта?

Прэзідэнт Злучаных Штатаў, не ў прыклад многім іншым буржуазным рэспублікам, зусім не адыгрывае толькі прадстаўнічую ролю. Прэзідэнт ЗША сапраўды ажыццяўляе выканаўчую ўладу, ён назначае міністраў, ад яго залежыць у велізарнай ступені фарміраванне ўсяго ўрадавага апарата і камплектаванне дзяржаўных устаноў, ён самым непасрэдным чынам уплывае на ўвесь курс знешняй і ўнутранай палітыкі краіны. Прэзідэнцкія выбары ў ЗША маюць таму жыццёвае значэнне для ўсёй краіны, і магчымыя кандыдаты на прэзідэнцкі пост абмяркоўваюцца з роўнай зацікаўленасцю ва ўсіх слаях грамадства.

Цэнтральная праблема ў даны момант— магчымасць вылучэння і выбрання ў трэці раз, на трэці тэрмін, цяперашняга прэзідэнта Франкліна Рузвельта.

Амерыканская канстытуцыя не забараняе перавыбіраць прэзідэнтаў трэці або нават чацвёрты раз. Але ў амерыканскім палітычным жыцці ўстанавілася цвёрдая традыцыя: адна і тая-ж асоба на пост прэзідэнта перавыбіраецца не больш двух раз. Гэту традыцыю ўстанавіў яшчэ першы прэзідэнт Злучаных Штатаў Георг Вашынгтон. З часу Вашынгтона ўстаноўленая ім традыцыя ні разу не была парушана. Але зараз пытанне аб яе парушэнні ўзнікла з незвычайнай астратой.

Прапанова аб перавыбранні на трэці тэрмін Рузвельта высунута цэлым радам грамадскіх і рабочых арганізацый. Яго падтрымліваюць перадавыя, прагрэсіўныя палітычныя дзеячы ЗША, яна абмяркоўваецца ва ўсім друку.

Генеральны сакратар амерыканскай кампартыі тав. Браўдэр зрабіў нядаўна трохтыднёвую паездку па ЗША і прачытаў рад дакладаў на тэму аб палітычным становішчы і перспектывах прадстаячых у 1940 годзе выбараў. Браўдэр выступіў у радзе буйнейшых гарадоў — у Сан-Францыско, Лос-Анжэлосе, Дэнверы, Сіэтле, Мінеаполісе, Чыкаго. На яго даклады збіраліся тысячы людзей, якія прыязджалі для гэтай мэты спецыяльна з іншых гарадоў, часам за 1.000 кілометраў. (На даклады Браўдэра ў Каліфорніі, напрыклад, людзі прыязджалі з штата Арызона). Вярнуўшыся з гэтай паездкі, у якой ён несумненна меў магчымасць азнаёміцца з настроямі самых шырокіх кругоў насельніцтва, Браўдэр заявіў:

— Што мяне больш за ўсё здзівіла ў часе паездкі, — рух за перавыбранне Рузвельта на трэці тэрмін. Гэту прапанову паўсямесна абмяркоўвае друк. Народ усюды гаворыць аб гэтым, а грамадскія арганізацыі пачынаюць ужо сёе-тое ў гэтым напрамку прадпрымаць...

Рузвельт, вярней, палітычны дзеяч тыпу Рузвельта, прадстаўляе сабою зараз тую кандыдатуру на пост прэзідэнта, вакол якой аднаюцца антыфашысцкія сілы, прыхільнікі міру і дэмакратыі.

У 1932 годзе, калі Рузвельт у першы раз выбіраўся на пост прэзідэнта, яшчэ можна было сказаць, што выбаршчыкі галасавалі не столькі за яго, колькі супроць Гувера і супроць эканамічнага крызіса. Але на выбарах 1936 года, калі Рузвельт перавыбіраўся на другі тэрмін і атрымаў 27 мільёнаў галасоў, ніхто ўжо не мог адмаўляць, што гэта абсалютная большасць выбаршчыкаў галасавала за «новы курс», як называюць у ЗША праграму Рузвельта і праведзеныя ім у галіне ўнутранай і замежнай палітыкі мерапрыемствы.

Цэлы рад мерапрыемстваў «новага курса» сустракае падтрыманне працоўных і яраснае працідзеянне рэакцыйных элементаў: рабочае заканадаўства, забяспечыўшае рабочым ЗША тыя правы, якіх яны ніколі не мелі: заключаць калектыўныя дагаворы і арганізоўваць прафсаюзы; сістэма грамадскіх работ і дапамог беспрацоўным, якая змякчыла да пэўнай ступені пажар беспрацоўя, хоць-бы для часткі паражоных ім мільённых мас.

Праграмныя заявы Рузвельта па пытаннях замежнай палітыкі — аб барацьбе супроць агрэсараў, аб абароне міру — таксама заўсёды знаходзілі водгук у масах. Народ патрабуе ад урада правядзення ў жыццё палітыкі барацьбы за ўсеагульны мір і дэмакратыю.

У барацьбе за і супроць «новага курса», за і супроць Рузвельта, як магчымага кандыдата ў трэці раз на прэзідэнцкі пост, адбываецца рэзкая палярызацыя сіл —сіл рэакцыі з аднаго боку і сіл дэмакратыі—з другога. Гэта барацьба змятае старыя рамкі двух буйных партый амерыканскай буржуазіі, якія на працягу многіх год стаялі пачаргова ва ўладзе.

Асноўнае ядро рэспубліканскай партыі прадстаўляе сабою ў даны час той цэнтр, вакол якога групіруюцца ўсе сілы рэакцыі.

Унутры дэмакратычнай партыі, партыі прэзідэнта Рузвельта, адбылося расслаенне, фактычны раскол. У ёй вызначылася рэакцыйнае крыло, якое вядзе барацьбу супроць «новага курса» і Рузвельта. Рэакцыйнае крыло дэмакратаў змыкаецца з рэспубліканскай партыяй, выступае салідарна з ёй і нават вядзе з ёй перагаворы аб сумесным стварэнні новай партыі.

Рэакцыйныя дэмакраты і рэспубліканцы ўтварылі рэакцыйны блок у кангрэсе (парламенце). Блок гэты ўзначальваюць сенатары Глас, Вандэнберг, Тафт. Нядаўна закончыўшаяся сесія кангрэса была арэнай жорсткай барацьбы паміж староннікамі «новага курса» і рэакцыйным блокам. Гэтаму блоку ўдалося затармазіць і нават праваліць рад пачынанняў урада. Кангрэс урэзаў сродкі, патрабуемыя ўрадам на дапамогу беспрацоўным і грамадскія работы, нанёс істотны ўдар усёй сістэме грамадскіх работ, скараціў стаўкі заработнай платы асобам, занятым на грамадскіх работах, і патрабаваў згортвання дапамогі беспрацоўнай інтэлігенцыі.

Праваліў кангрэс таксама прапанову ўрада аб пераглядзе існуючага так званага «закона аб нейтралітэце» ЗША. Гэты закон, не робячы адрознення паміж агрэсарам і той краінай, на якую нападае агрэсар, забараняе ЗША гандляваць з абодвума ваюючымі краінамі. «Нейтралітэт», па сутнасці, грае на-руку агрэсару.

У сілу гэтага-ж закона, ЗША не прадавалі зброі рэспубліканскай Іспаніі, як «ваюючай краіне».

Кангрэс стаў на пазіцыі «ізаляцыянізма» — праславутага «неўмяшання» ЗША ў еўрапейскія справы і ў міжнародныя канфлікты.

Кандыдаты на пост прэзідэнта будуць зацверджаны на з'ездах абедвух партый, якія адбудуцца ў пачатку будучага года. Кандыдаты, называемыя пакуль лагерам рэакцыі, наўрад ці могуць разлічваць на поспех сярод шырокіх мас. Усе яны прадстаўляюць самую чорную фашысцкую рэакцыю.

Імёны Гувераў, Тафтаў, Вандэнбергаў ненавісны масам, як імёны заклятых ворагаў рабочага класа. У якасці магчымых кандыдатаў рэакцыі называюць пакуль мацёрага чарнасоценца Томаса Дьюі, кандыдатуру якога падтрымлівае жоўты друк фашыста Херста, а таксама сенатара Вандэнберга, вядомага сваёй барацьбой у кангрэсе супроць рабочага заканадаўства.

Само сабой зразумела, што рэакцыйнае крыло дэмакратаў прыкладзе ўсе намаганні, каб не дапусціць высоўвання кандыдатуры Рузвельта на з'ездзе дэмакратычнай партыі. Тут староннікам «новага курса» прыдзецца вытрымаць вельмі сур'ёзны націск.

Сам Рузвельт яшчэ не зрабіў ніякай афіцыяльнай заявы, ці згодзен ён выставіць у трэці раз сваю кандыдатуру. Але ў цаінфармаваных палітычных кругах ЗША лічаць упаўне магчымым, што Рузвельт пойдзе на гэта.

У сувязі з актывізацыяй рэакцыі ў народных масах ЗША узмацняецца рух за перавыбранне Рузвельта. У падтрымцы гэтай кандыдатуры шырокія масы бачаць магчымасць аказаць адпор рэакцыі і не дапусціць прыходу яе да ўлады.

Даць адпор рэакцыі можа толькі аб'яднаны шырокі фронт усіх староннікаў дэмакратыі, усіх прагрэсіўных элементаў краіны, усіх тых, каму дорага справа барацьбы за мір і дэмакратыю, барацьбы супроць фашызма.

Н. СЯРГЕЕВА.

Замежны друк аб совецка-германскім дагаворы аб ненападзе

ГЕРМАНІЯ

БЕРЛІН, 24 жніўня. (ТАСС). Сёння германскія газеты на першых старонках змясцілі афіцыяльнае паведамленне германскага інфармацыйнага бюро аб перагаворах міністра замежных спраў фон Рыбентропа з таварышам Молатавым і аб падпісанні дагавора аб ненападзе паміж Германіяй і СССР. На першых старонках газет надрукаван тэкст дагавора аб ненападзе паміж Германіяй і СССР.

Афіцыёз германскага міністэрства замежных спраў «Дэйчэ дыпламатыш-палітышэ карэспандэнц» у спецыяльным выпуску, прысвечаным германа-совецкім адносінам, піша, што паляпшэнне адносін паміж Германіяй і Совецкім Саюзам выклікала ў Германіі пачуццё глыбокага задаволення. Паварот у адносінах абодвух вялікіх народаў, піша «Дэйчэ дыпламатыш-палітышэ карэспандэнц», адпавядае пазіцыі, якая праводзілася Германіяй у адносінах да вялікай нацыі на ўсходзе на працягу соцень год. Паведамленне аб ліквідацыі напружаных адносін паміж двума вялікімі дзяржавамі будзе з аблягчэннем успрынята народамі, якія падвяргаліся небяспецы быць скарыстанымі ў чужых інтарэсах.

Газета «Фелькішэр беабахтэр» піша, што вестка аб новым пакце паміж Германіяй і СССР успрынята германскім народам, як аднаўленне таго становішча, якое заўсёды існавала паміж народамі Германіі і Расіі, за выключэннем кароткага перапынку. «Новы дагавор з Масквой, — піша далей газета, — гэта — прынцыповая палітыка, сэнс якой састаіць у тым, каб захаваць добрыя адносіны паміж народамі, якія не раздзелены ніякімі «супярэчнасцямі». Нідзе на шляху Германіі і СССР, піша газета, няма варожасці інтарэсаў. Гэтымі прычынамі і аб'ясняецца той факт, што абедзве дзяржавы на працягу стагоддзяў жылі ў міру і падтрымлівалі жыццёвыя сувязі.

Газета «Дэйчэ альгемейне цэйтунг» сёння на першай старонцы змясціла вялікі артыкул пад загалоўкам «Совецкі Саюз». У гэтым артыкуле даецца эканамічны агляд СССР і выкладаецца яго дзяржаўнае і палітычнае ўстройства.

ЯПОНІЯ

ТОКІО, 24 жніўня. (ТАСС). Паведамленне аб заключэнні германа-совецкага дагавора аб ненападзе зрабіла вялікае ўражанне ў палітычных кругах Японіі. Сёння ўсе газеты запоўнены каментарыямі, падкрэсліваючымі міжнароднае значэнне дагавора паміж Германіяй і СССР.

Газета «Тэйто ніці ніці» піша: «У рэзультаце заключэння пакта аб ненападзе паміж СССР і Германіяй, палітычная каштоўнасць антыкомінтэрнаўскага пакта звядзецца да нуля. Зараз, дзякуючы наяўнасці гэтага пагаднення, выявяцца супярэчанні паміж Японіяй, з аднаго боку, Германіяй і Італіяй — з другога боку. Такім чынам, Японія, ведучы вайну, поўнасцю траціць саюзнікаў і спачуваючых. У сучасны момант няма ўплывовай краіны, якая можа аказаць падтрыманне Японіі. Японія аказваецца зусім ізаліраванай у міжнародных справах. Заключэнне дагавора паміж Германіяй і СССР выклікае песімістычны настрой у народзе. Многія думаюць, што гэта акажа дрэнны ўплыў на вайну ў Кітаі».

Газета «Ніці ніці» піша, што палітыка Англіі, накіраваная да акружэння Германіі, узмацніла імкненне Германіі да зблежэння з СССР.

АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 24 жніўня. (ТАСС). Лонданскія газеты змяшчаюць на самых відных месцах паведамленне аб заключэнні германа-совецкага дагавора і тэкст самога дагавора.

Заключэнне дагавора дала раду газет і палітычных дзеячоў падставу для рэзкай крытыкі палітыкі Чэмберлена. Аглядальнік газеты «Стар» піша: «Масква лічыць, што Чэмберлен ніколі не думаў заключаць пакт з Совецкай Расіяй, што Чэмберлен цешыў сябе думкай аб скліканні канферэнцыі пяці дзяржаў, з якой быў-бы выключан Совецкі Саюз».

Газета «Манчэстэр гардыен» адзначае, што «падзеі апошніх год унушылі совецкаму ўраду глыбокае недавер'е да французскай і англійскай палітыкі».

Газета «Дэйлі уоркер» заклікае палату абшчын прымусіць Чэмберлена адказаць, чаму ён сваёй палітыкай давёў Англію да кануна вайны. Газета змяшчае на відным месцы рэзалюцыю металістаў завода «Родэпсайд», у Баркінгу, у якой заяўляецца: «Мы захапляемся цярпеннем, праяўленым СССР у перагаворах з англійскім урадам, і лічым правільнай палітыку совецкага ўрада, падпісаўшага пакт аб ненападзе з Германіяй. Мы лічым, што гэта лішні раз сведчыць аб магутнасці Совецкага Саюза».

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 24 жніўня. (ТАСС). Французскі друк удзяляе выключна вялікую ўвагу дагавору аб ненападзе паміж СССР і Германіяй. Газета «Тан» прыводзіць змест перадавых артыкулаў «Праўды» і «Известий», прысвечаных дагавору.

Рад газет, блізкіх да афіцыяльных кругоў, прабуюць ашукаць грамадскую думку Францыі адносна сапраўднай сутнасці заключанага дагавора. Характэрна, што газеты «Журналь дэ дэба», «Тан» і іншыя, якія ўзмоцнена імкнуліся сутыкнуць Совецкі Саюз з Германіяй, цяпер усяляк прабуюць даказаць, што дагавор не выгадны для абодвух старон.

Блізкія да афіцыяльных кругоў газеты прабуюць перакласці на СССР адказнасць за няўдачу англа-франка-совецкіх перагавораў. Адказваючы на гэтыя інсінуацыі, газета «Се суар» заяўляе, што прыбыўшыя ў Маскву англійская і французская ваенныя місіі не мелі поўнамоцтваў нават для заключэння пагадненняў чыста-тэхнічнага парадку. Газета падкрэслівае, што ў Лондане ўзмоцнена цыркуліравалі чуткі аб тым, што Чэмберлен, адпраўляючы ваенную місію ў Маскву, хацеў тым самым аблегчыць сабе роспуск парламента на канікулы.

Дарнер у газеце «Юманітэ» падкрэслівае, што СССР сваёй цвёрдай палітыкай робіць сур'ёзны ўклад у справу міру.

ЗША

НЬЮ-ЁРК, 24 жніўня. (ТАСС). Паведамленне аб совецка-германскім дагаворы аб ненападзе выклікала выключна ажыўленыя водгукі амерыканскага друку.

Вядомая амерыканская журналістка Дароці Тампсон выступіла па радыё з прамовай, у якой заявіла, што дагавор аб ненападзе паміж СССР і Германіяй прадстаўляе велізарную дыпламатычную перамогу Совецкага Саюза. Буйнае міжнароднае значэнне дагавора падкрэсліваецца Леланд Стоу ў газеце «Нью-Ёрк геральд трыбюн», палітычным аглядальнікам агенцтва «Асашыэйтэд прэс» Макензіі і радам вашынгтонскіх карэспандэнтаў амерыканскіх газет.

Многія карэспандэнты лічаць, што заключэнне дагавора азначае моцны адпор мюнхенцам, якія прабавалі нацкаваць Германію на Совецкі Саюз.

Газета «Нью-Ёрк дэйлі ньюс» піша, што совецка-германскі пакт аб ненападзе змяншае пагрозу вайны.

Газета адзначае, што гэты дагавор з'яўляецца для ЗША выгодным, бо паслабляе пазіцыі Японіі. Такім чынам, піша газета, «ускосна совецка-германскі дагавор выгодны для ЗША, паколькі Японія з'яўляецца нашым магчымым праціўнікам».

ІТАЛІЯ

РЫМ, 24 жніўня. (ТАСС). Італьянскі друк расцэньвае заключэнне дагавора аб ненападзе паміж СССР і Германіяй, як падзею велізарнага значэння. Карэспандэнты італьянскіх газет у Берліне падкрэсліваюць у сваіх паведамленнях, што Германія прыйшла да рашэння аб заключэнні дагавора з Совецкім Саюзам па парадзе і з поўнай згоды Італіі. Італьянскія газеты «Папола д'Італіа», «Рэджыме фашыста» і іншыя праяўляюць асаблівую зацікаўленасць да пытання аб тым, як адаб'ецца совецка-германскі дагавор аб ненападзе на палітыцы Балканскіх краін і Турцыі.

ФІНЛЯНДЫЯ

ХЕЛЬСІНКІ, 24 жніўня. (ТАСС). Усе газеты публікуюць пад буйнымі загалоўкамі змест совецка-германскага дагавора аб ненападзе.

Газета «Уусі суомі» піша сёння ў перадавым артыкуле: «Нельга адмаўляць таго, што ўзаемнае разуменне паміж Германіяй і Совецкім Саюзам, несумненна, садзейнічае ўмацаванню міру і бяспечнасці малых краін Балтыйскага мора».

ЭСТОНІЯ

ТАЛІН, 24 жніўня. (ТАСС). Паведамленне аб заключэнні совецка-германскага дагавора аб ненападзе быстра пашырылася па гораду і выклікала паўсямеснае абмеркаванне.

«Газета «Пявалехт» піша аб значэнні пакта: «Выясняючы палітычны ўплыў пакта, трэба адзначыць, што пазіцыя Совецкай Расіі яшчэ больш умацавалася». Газета падкрэслівае, што ў выніку заключэння дагавора аб ненападзе паміж СССР і Германіяй «у Японіі пануе змяшанне».

ТУРЦЫЯ

АНКАРА, 24 жніўня. (ТАСС). Сёнешнія ранішнія газеты змяшчаюць абшырныя водгукі на перагаворы паміж СССР і Германіяй. Газеты пішуць, што заключаны паміж Совецкім Саюзам і Германіяй пакт аб ненападзе трэба разглядаць, як гарантыю супроць вайны ў Еўропе.

Газета «Вакыт» у перадавым артыкуле піша, што ў асобе СССР — аднаго з удзельнікаў совецка-германскага пакта — выступае кроўны друг Турцыі, даказаўшы сваю дружбу ў цяжкія дні турэцкай барацьбы за незалежнасць: «Турцыя можа быць задаволенай, — гаворыцца ў перадавым артыкуле, — што на адной з граніц СССР знішчаецца непакой. Газета заяўляе, што СССР заўсёды прыдаваў сілу фронту міру».

Газета «Сон тэлеграф» указвае, што пагадненне паміж Германіяй і СССР разглядаецца ва ўсім свеце, як вялікая палітычная падзея. Газета піша, што гэты дагавор будзе скарыстан прыяцелямі міру для барацьбы за ўмацаванне пазіцый міру.

ВАЕННЫЯ МЕРЫ У АНГЛІІ

ЛОНДАН, 25 жніўня. (ТАСС). У Лондане афіцыяльна аб'яўлена, што ўсе асобы, якія ўходзяць з дома, абавязаны браць з сабой процівагазы. Школьным настаўнікам, якія знаходзяцца ў водпуску, прапанавана вярнуцца ў школы, калі апошнія размешчаны ў паграseverажаемых раёнах. Усім паліцэйскім Лондана, атрымаўшым водпускі, прапанавана вярнуцца на службу. Музеі і мастацкія галерэі часова закрыты, каб упакаваць на выпадак эвакуацыі мастацкія творы, прадстаўляючыя нацыянальную каштоўнасць.

Ваенныя мерапрыемствы Польшчы

ВАРШАВА, 25 жніўня. (ТАСС). Урад выдаў рад распараджэнняў ваеннага характару. Адменены ўсе водпускі дзяржаўным служачым. Пачатак заняткаў у польскіх школах адтэрмінован. У Варшаве забаронен продаж спіртных напіткаў. Урадавы камісар Варшавы звярнуўся да насельніцтва горада з заклікам прыняць удзел у будаўніцтве траншэй у прадмесцях польскай сталіцы.

ФІНЛЯНДСКІ МІНІСТР АБ УСЕСАЮЗНАЙ ВЫСТАЎЦЫ

ХЕЛЬСІНКІ, 25 жніўня. (ТАСС). Фінляндскі міністр земляробства Хейкінен даў інтэрв'ю прадстаўнікам газет «Суомен соцыялдэмакраці», «Хельсінгін саномат» і «Уусі суомі», у якім ён падзяліўся сваімі ўражаннямі аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Хейкінен адзначае радушны прыём, аказаны яму ў Совецкім Саюзе. Павелічыўшы аб грандыёзных размерах Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, Хейкінен заявіў, што яму асабліва спадабаліся павільёны Украіны, Грузіі, вопыты Мічурына і новыя плантацыі каучука.

«Выстаўка па архітэктуры і арганізацыі, — сказаў міністр, — робіць найлепшае ўражанне. Прадстаўленыя на выстаўцы расліны, фрукты і гародніна ўказваюць на тое, што ў гэтай галіне дасягнуты добрыя рэзультаты. Паездка была ва многіх адносінах павучальнай і цікавай. Па маёй думцы, многім з нашай краіны следавала-б пазнаёміцца з выстаўкай».

Прыезд лідэра індыйскага нацыянальнага кангрэса ў Кітай

ЧУНЦЫН, 25 жніўня. (ТАСС). 198 грамадскіх, навуковых і культурных арганізацый Чунцына 23 жніўня віталі прыезд аднаго з лідэраў нацыянальнага кангрэса Індыі Неру. На мітынгу з прывітальнай прамовай выступіў старэйшы член Гоміндана У Ці-вей, які дзякаваў у асобе Неру народ Індыі за сімпатыю і дапамогу Кітаю ў яго барацьбе. Неру сказаў гарачую прамову аб агульных інтарэсах і задачах барацьбы за нацыянальна-вызваленчы рух народаў Індыі і Кітая.

Назначаны вечарам 23 жніўня прыём у чэсць Неру быў адкладзен з прычыны паветранай трывогі. Неру заявіў карэспандэнтам, што мае намер наведаць розныя пункты Кітая, у тым ліку паўночны захад, дзе працуе медыцынскі атрад дактароў-індусаў, пасланых у Кітай нацыянальным кангрэсам Індыі.

СТАНОВІШЧА Ў ГАНКОНГУ

ШАНХАЙ, 24 жніўня. (ТАСС). На граніцы Ганконга па-ранейшаму напружаная абстаноўка. Па паведамленню газеты «Даваньбао», лік японскіх войск і войск марыянетачнага «ўрада» ў гэтым раёне даведзен да 10 тысяч. Па загаду англійскіх улад на граніцы знішчаюцца масты, рыюцца траншэі і ўстанаўляюцца цяжкія кулямёты. Ёсць весткі, што, у сувязі з напружанай абстаноўкай, у Ганконг ляцяць 100 англійскіх ваенных самалётаў.

***

ШАНХАЙ, 25 жніўня. (ТАСС). У сувязі з абвастрэннем палажэння на граніцах англійскай калоніі ў Кітаі — Ганконга там ідуць кругласутачныя абарончыя работы. Уваходы ў Ганконгскую гавань мініраваны. На камандных высотах устаноўлены дальнебойныя гарматы. Улады рэкамендуюць жанчынам і дзецям эвакуіравацца ў Манілу і Макао.

***

ШАНХАЙ, 24 жніўня. (ТАСС). Паводле паведамлення газеты «Цзунмэйцыбао», у ноч на 23 жніўня група японскіх салдат заняла англійскую тэрыторыю на паўночны ўсход ад Ганконга. Пад націскам 50 англійскіх салдат японцы адступілі.

З мэтай перашкодзіць прасоўванню японцаў, па загаду англійскіх улад разбуран пагранічны ўчастак Кантон—Коулунскай чыгункі і частка шасе. Англічане, якія пражываюць ля граніцы, эвакуіруюцца ў Ганконг.

Японцы страцілі забітымі 600 чалавек

ШАНХАЙ, 25 жніўня. (ТАСС). Газета «Цзунмейжыбао» паведамляе, што ў раёне Цзянмыня (на поўдзень ад Кантона) за апошнія дні адбываюцца сур'ёзныя баі паміж кітайскімі рэгулярнымі часцямі і японскімі войскамі. У ноч на 22 жніўня кітайскія часці атакавалі японскія пазіцыі ў Пзянмыне. Японцы, якія панеслі вялікія страты, рашылі нанесці кітайцам сакрушальны ўдар і раніцой 23 жніўня, прымяніўшы газы, пачалі контрнаступленне. Бой прадаўжаўся да позняй ночы. Японцы і на гэты раз пацярпелі паражэнне, страціўшы забітымі каля 600 чалавек.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

21 жніўня кітайскія часці пасля артылерыйскай падрыхтоўкі перарвалі лінію японскай абароны і з боем увайшлі ў Чантайгуань, які размешчан у паўднёвай частцы правінцыі Хэнань, на поўнач ад Сіньяна. На вуліцах завязаўся гарачы бой. Вестак аб рэзультаце бою пакуль няма.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

21 жніўня кітайскія часці пачалі атаку на горад Лішы, размешчаны ў заходняй частцы правінцыі Шаньсі, на паўднёвы захад ад Тайюані. Вакольныя вёскі захвачаны кітайскімі войскамі. Бой прадаўжаецца.

У паўднёва-заходняй частцы правінцыі Шаньсі, у раёне Цзечжоу, кітайскія войскі прадаўжаюць цясніць японцаў па шасе ў паўночным напрамку. Паводле афіцыяльных даных, японскія войскі ў апошніх аперацыях у гэтым раёне страцілі забітымі і раненымі больш 15 тыс. чал.

БАЛГАРСКІЯ ДЭПУТАТЫ ВЯРНУЛІСЯ Ў СОФІЮ

СОФІЯ, 25 жніўня. (ТАСС). Вярнулася група балгарскіх дэпутатаў, наведаўшых нядаўна СССР. Дэпутаты выразілі задавальненне прыёмам, які быў ім аказан у Совецкім Саюзе.

ПЕРАГАВОРЫ ПАМІЖ ПОЛЬШЧАЙ І ДАНЦЫГАМ СПЫНЕНЫ

ЛОНДАН, 24 жніўня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе па радыё, што, па вестках з Берліна, перагаворы паміж Польшчай і Данцыгам па пытанню аб мытных чыноўніках спынены ў сувязі з ад'ездам польскіх дэлегатаў у Варшаву.

Перамога амерыканскіх фермераў

НЬЮ-ЁРК, 24 жніўня. (ТАСС). Забастоўка фермераў, якія снабжаюць Нью-Ёрк малаком, закончылася перамогай бастуючых. Забастоўка прадаўжалася 9 дзён. У рэзультаце снабжэнне Нью-Ёрка малаком скарацілася на 50 проц. Буйныя трэсты, якія скупаюць малако ў фермераў, былі вымушаны пайсці на ўступкі і павысілі цану, уплачваемую фермерам за малако.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПРЫЗЫВА Ў РСЧА І ВАЕННА-МАРСКІ ФЛОТ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). У Гомелі і ў раёнах вобласці разгарнулася дзейная падрыхтоўка да чарговага прызыва ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот.

Сотні маладых грамадзян — гарачых патрыётаў соцыялістычнай радзімы — з нецярплівасцю чакаюць радаснай мінуты, калі яны ўвальюцца ў баявыя рады слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

На імя ваенкаматаў штодзенна паступаюць дзесяткі заяў прызыўнікаў з просьбай датэрмінова паслаць іх у Чырвоную Армію.

У сваім пісьме на імя Наркома абароны Маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава маладыя калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Молатава, Гомельскага раёна, пт. Траянцаў, Волкаў, Кроўцікаў просяць прызваць іх датэрмінова ў Чырвоную Армію і стварыць з іх танкавы экіпаж.

Аб залічэнні ў Чырвоны Ваенна-Марскі Флот на пажыццёвую службу просіць комсамолец горада Добруша тав. Вобода. Прызыўнікі горада Гомеля браты Вульф і Наум Хейфец адмовіліся ад ільготы і прасілі паслаць іх у ваеннае вучылішча. Іх просьба задаволена.

Паміж раёнамі вобласці разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва на ўзорную падрыхтоўку і правядзенне прызыва гэтага года. Сярод прызыўнікаў Гомельскай вобласці — 47,3 проц. варашылаўскіх стралкоў, 34 проц. значкістаў ГСА, 36 проц. значкістаў ГПА і 54 проц. ППХА.

Многія прызыўнікі аўладалі лётнай справай, сталі першакласнымі стралкамі, выдатнымі гранатамётчыкамі і вельмі добрымі кулямётчыкамі.

Першынства ў спаборніцтве раёнаў вобласці заняў Жураўціцкі раён (райваенком тав. Гладкі). У раёне 68 проц. прызыўнікаў — варашылаўскія стралкі, 61 проц. — значкісты ГПА, 61 проц. — ГСА і 70 проц. — ППХА.

У раёнах вобласці праходзяць канферэнцыі прызыўнікаў.

У сваіх выступленнях будучыя байцы Чырвонай Арміі выказваюць сваю любоў і адданасць большэвіцкай партыі і вялікаму Сталіну, сваю гатоўнасць стаць у баявыя сцягі Чырвонай Арміі.

Н. ГІРШЫН.

577 чалавек прынята ў ВНУ Гомеля

ГОМЕЛЬ. Закончыліся прыёмныя экзамены ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Гомеля. У педагагічны інстытут імені Чкалава прынят 231 чалавек, у настаўніцкі — 210, у лесатэхнічны — 136.

Большасць прынятых у вышэйшыя навучальныя ўстановы — выпускнікі сярэдніх школ. У лесатэхнічны інстытут на факультэт механізацыі і апрацоўкі дрэва прынят знатны стаханавец горада тав. Рабцаў, занесены на раённую дошку пашаны. (БЕЛТА).

АНСАМБЛЬ ЦЫГАНСКАЙ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ

ВІЦЕБСК. Сярод рабочых і работніц цыган чулочна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» многа адораных выканаўцаў цыганскіх песень і танцаў. Нядаўна з ліку лепшых выканаўцаў мастацкай самадзейнасці створан ансамбль песні і пляскі, у саставе 20 чалавек. У яго рэпертуары — старадаўнія напевы і танцы, а таксама сучасныя песні аб радасці соцыялістычнай працы ў дружнай сям'і народаў Совецкага Саюза.

Кіруе ансамблем шофер Александр Матусаў. Першыя выступленні самадзейнага калектыва карыстаюцца ў працоўных Віцебска вялікім поспехам.

(БЕЛТА).

УСЕБЕЛАРУСКІЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА ПЛАВАННЮ

ГОМЕЛЬ. 24 жніўня на гомельскай воднай станцыі пачаліся спаборніцтвы на першынства БССР па плаванню і прыжках у ваду. У спаборніцтвах прымаюць удзел каманды 8 гарадоў рэспублікі — Мінска, Гомеля, Віцебска, Магілева і інш.

У першы дзень спаборніцтва лепшыя рэзультаты паказалі каманды Гомеля і Мінска.

Спаборніцтвы прадоўжацца тры дні.

(БЕЛТА).

1174 КІЛОМЕТРЫ НА БУКСІРЫ У МАТАЦЫКЛАЎ

24 жніўня ў Мінску адбыўся фініш мота-велапрабегу студэнтаў Беларускага ордэнаноснага інстытута фізічнай культуры. Веласіпедысты—удзельнікі прабегу—ўсю дыстанцыю прайшлі на буксіры ў матацыклаў. На асобных участках скорасць руху даходзіла да 70—80 кіламетраў у гадзіну.

ГАСТРОЛІ РАГАЧОЎСКАГА КАЛГАСНАГА ТЭАТРА У КРЫЧАВЕ

КРЫЧАЎ. У горадзе з поспехам прайшлі гастролі Рагачоўскага калгасна-соўгаснага тэатра. Працоўныя раённага цэнтра прагледзелі пастаноўкі «Егор Булычоў» — Горкага, «Дурніца для другіх, разумная для сябе» — Лопе дэ Вега, «У пушчах Палесся» — Якуба Коласа і «Пагібель воўка» — Эдуарда Самуйлёнка. Асабліва добрыя водгукі ў гледачоў выклікала новая пастаноўка тэатра — «Пагібель воўка».

ХРОНІКА МАСТАЦТВАЎ

24 жніўня балетны калектыў Вялікага Дзяржаўнага опернага тэатра абмяркоўваў эскізы дэкарацый мастака Матруніна да балета «Салавей». Балет рыхтуецца для паказу на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Прысутныя адобрылі афармленне балета «Салавей».

***

Беларускі кампазітар Н. Н. Шчэглоў закончыў работу над операй «Кацярына» (лібрэта М. Клімковіча). Опера прынята для пастаноўкі Вялікім Дзяржаўным тэатрам оперы і балета БССР.

***

30 жніўня пачынаецца асенне-зімовы сезон у першым драматычным тэатры БССР. Першым спектаклем пойдзе «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка. Спектакль значна даапрацаван і пракансультыраваны заслужаным артыстам РСФСР — ордэнаносцам Раеўскім.

ДЗЁННІК

⊙ Сёння, у 9 гадзін вечара, у Доме партактыва адбудзецца грамадскі прагляд кінофільма «Іван Гудаў». Запрашаюцца кіраўнікі пярвічных партарганізацый, старшыні фабзаўмясцкомаў, гаспадарнікі, агітатары і прапагандысты г. Мінска. Білеты—у райкомах КП(б)Б.

⊙ 26 жніўня, у 7 гадзін вечара, у клубе хлебазавода (вул. Н. Астроўскага, 24) адбудзецца нарада сакратароў пярвічных арганізацый Варашылаўскага раёна. Яўка абавязкова.

В. а. адказнага рэдактара
Т. С. ГАРБУНОЎ

ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

28 жніўня

Прэм'ера

ДРЫГВА

Сапраўдны абанемент № 97.

Опера ў 4-х дзеях.

Білеты, узятыя на 23 жніўня, сапраўдны на 28.

Спектакль «РУСАЛКА» 30/VIII адмяняецца.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» — «ОГНЕННЫЕ ГОДЫ»

Кінотэатр «Радзіма» — «МУЖЕСТВО»

Кінотэатр «Інтэрнацыянал» — 1. «Іван Гудов» 2. «Случай на границе»

Дзіцячае кіно — «ЛЮДИ ДОЛИНЫ СУМБАР»

Кіно «Спартак» — «КОЛЛЕЖСКИЙ РЕГИСТРАТОР»

Кіно «Парыжская Комуна» (Пушкіна 64) — «КАТЕРИНА»

Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ» — 1. Журналы Маскоўскай студыі кінохронікі № 72 і 73. 2. «Пионерия» № 10. 3. Журнал Мінскай студыі кінохронікі № 38.

ДЗЯРЖЦЫРК

Сёння поўная перамена праграмы

Працяг гастроляў засл. арт. рэсп. Барыса ЭДЭРА з яго групай ЛЬВОЎ

1-я гастроль БІМ-БОМ музыкальныя клоуны.

2 РАЙТ эксцэнтрыкі з аслом і шмат іншых новых нумароў.

Ля каўра ЧАРЛІ ЧАПЛІН.

Пачатак у 9 гадзін вечара.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

30 жніўня

адкрыццё сезона 1939-40 г.

Спектаклі будуць пачынацца роўна ў 7 г. 30 м. вечара. Каса адкрыта з 2 г. дня да 8 г. вечара беспераппынна.

Прымаюцца заяўкі на пастаянныя месцы, культпаходы і мэтавыя спектаклі.

НАРКОМЗДРАВ СССР ХИМФАРМПРОМ

НОВЫЙ ПРЕПАРАТ ПРОТИВ ОЖИРЕНИЯ

ЭНДОКСИКРИН

ВЫПУСКАЕТСЯ МОСКОВСКИМ ЗАВОДОМ ЭНДОКРИННЫХ И ВИТАМИННЫХ ПРЕПАРАТОВ

ПРОДАЖА во ВСЕХ АПТЕКАХ

МІНГОРПРАМГАНДАЛЬ

У ШКОЛАХ №№ 6, 8, 11, 14, 15, 20, 21, 22, 23, 24, 25, 26, 28, 30, 31, 32, 33, 36, 37, 38, 40, 44, 46, 47, 49,

ПРЫ БЕЛПЕДВУЧЫЛІШЧЫ, ШКОЛЕ НКГ І БУДАЎНІЧЫМ ТЭХНІКУМЕ

25 жніўня АДКРЫВАЕ ШКОЛЬНЫЯ КІЁСКІ

ПА ПРОДАЖУ ШКОЛЬНА-ПІСЬМОВЫХ ПРЫЛАД.

ДА КІЁСКАЎ У ШКОЛАХ прымацаваны дзіцячыя дамы №№ 1, 2, 5 і тэхнікум хлебапячэння.

МІНГОРПРАМГАНДАЛЬ.

Навучальны камбінат Беларускага аддзялення „СОЮЗОРГУЧОТ"

аб'яўляе НАБОР курсантаў

на 6-месячныя курсы па падрыхтоўцы бухгалтароў для сістэмы Наркамлеса БССР

На курсы прымаюцца асобы, якія маюць стаж бухгалтарскай работы па падвойнай сістэме не ніжэй 2-х год і асвету не ніжэй 7 класаў.

Стыпендыя ад 225 да 275 руб. у месяц (у залежнасці ад паспяховасці) і 40—50 руб. кватэрных.

Паступаючыя павінны прадставіць наступныя дакументы: пасведчанне аб адукацыі, метрычны выпіс, даведкі — аб стане здароўя, аб працоўным стажы ў галіне рахунаводства і аб аслабаненні з апошняга месца работы, аўтабіяграфію, дзве фотакарткі, а таксама паштовых марак на 60 кап. для адказу.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 10 ВЕРАСНЯ 1939 г.

Іспыты праводзяцца па беларускай і рускай мовах, матэматыцы, палітграмаце і ўчоту. Яўка на іспыты — па выкліку камбіната. Праезд на іспыты камбінатам не аплачваецца.

Даведкі можна атрымаць з 11 да 2 г. дня.

Заявы з дакументамі пасылаць па адрасу: гор. Мінск, Рэволюцыйная, 3, навучальнаму камбінату «Саюзоргучот».

ДЫРЭКЦЫЯ.

Бацькі і вучні! непатрэбныя вам стабільныя падручнікі

ПРАДАВАЙЦЕ кніжным і культмагазінам і кіёскам Упраўлення кнігагандля ДВБ, КОГІЗ'а і мясцовага гандлю

У МЕНСКУ:

У магазінах ДВБ
№ 1 — Ленінская, 15
№ 2 — Няміга, 15
№ 3 — Совецкая, 39
№ 4 — Совецкая, 147
№ 7 — Совецкая, 47

У магазінах КОГІЗ'а
№ 1 — Совецкая 57
№ 3 — Совецкая, 71

У магазінах Менпромгандля
№ 28 — Ленінская, 15
№ 8 — Совецкая, 29

У АСТАТНІХ ГАРАДАХ І РАЁНАХ БССР УСІМ КНІЖНЫМ І КУЛЬТМАГАЗІНАМ І КІЁСКАМ У ШКОЛАХ.

Уп. Галоўлітбела № Л—2540. Мінск. друкарня «Звязды». Совецкая. 49. П., М., Ш.